Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ВЕРАСНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 172 (27287) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЧАЦВЁРТАЕ ЗОЛАТА ІГАРА БОКІЯ



Фота БЕЛТА.

**Беларускі плывец Ігар Бокій заваяваў 4 верасня чацвёртае золата на лонданскіх Паралімпійскіх гульнях-2012.**

18-гадовы бабруйчанін фінішаваў першым у фінале дыстанцыі на 400 м вольным стылем. Пры гэтым ён зноў двойчы за дзень абнавіў сусветны рэкорд. У папярэднім заплыве ён паказаў вынік 4 хв.2,83 сек., а ў фінале больш як на 4 сек. палепшыў сваё ж дасягненне — 3 хв.58,78 сек.

Бліжэйшы канкурэнт Даніла Чуфараў з Украіны адстаў адразу больш як на 7 сек.

## СЯРЭДНЕСТАТЫСТЫЧНЫ КАНДЫДАТ У ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ — БУЙНЫ КІРАЎНІК МЯСЦОВАГА ЎЗРОЎНЮ, СТАРЭЙШЫ ЗА 40 ГАДОЎ

**Сярэднестатыстычны кандыдат у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання — буйны кіраўнік мясцовага ўзроўню, старэйшы за 40 гадоў, вядомы на тэрыторыі свайго рэгіёну. Аб гэтым паведаміла журналістам старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, падводзячы вынікі рэгістрацыі кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі.**

Лідзія Ярмошына звярнула ўвагу, што ўпершыню на пасаду сенатара вылучаны кіраўнік Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і кіраўнік Гродзенскай абласной арганізацыі БРСМ. «Гэта прызнанне заслуг гэтай арганізацыі на дзяржаўным узроўні», — падкрэсліла старшыня ЦВК.

Характарызуючы ў цэлым склад зарэгістраваных кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, Лідзія Ярмошына адзначыла, што сярод іх нямала вядомых асоб.

Як раней паведамлялася, сёння на пасяджэнні ЦВК было прызнана правамоцным вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі па ўсіх абласцях і па Мінску.

Выбары ў Савет Рэспублікі павінны прайсці з 6 па 25 верасня ўключна.

Членаў верхняй палаты парламента выбіраюць шляхам тайнага галасавання на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню ў кожнай вобласці і дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета — па восем чалавек ад кожнай вобласці і Мінска.

Яшчэ восем сенатараў назначае Прэзідэнт.

**БЕЛТА.**



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ КАЛЕКТЫЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ З 90-ГОДДЗЕМ ГЭТАЙ УСТАНОВЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з 90-годдзем з дня заснавання гэтай установы. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, за гэтыя гады бібліятэка прайшла вялікі і слаўны шлях, унесла важкі ўклад у станаўленне і развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы незалежнай беларускай дзяржавы. Надзвычай важнай падзеяй стала адкрыццё новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, які даў ёй магчымасць стаць адной з лепшых нацыянальных бібліятэк свету, месцам, дзе праходзяць грамадска-палітычныя мерапрыемствы міжнароднага ўзроўню.

«Сёння бібліятэка з'яўляецца захавальніцай унікальнай калекцыі кніг і іншых дакументаў ад старадрукаваных выданняў да найноўшых электронных носьбітаў, буйнейшым інфармацыйным і сацыяльна-культурным цэнтрам краіны, вядучай навукова-даследчай і метадычнай установай у галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, — гаворыцца ў віншаванні. — Дасягнутыя поспехі — гэта перш за ўсё заслуга калектыву бібліятэкі, дзе працуюць выдатныя прафесіяналы і сапраўдныя энтузіясты сваёй справы».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў супрацоўнікам і чытачам Нацыянальнай бібліятэкі моцнага здароўя, поспехаў у працы, шчасця і дабрабыту.



## ЛІЧБА ДНЯ

***4,2** млн кв.м жылля будзе пабудавана ў краіне сёлета. У наступным годзе прадугледжаны ўвод жылля ў аб'ёме 6,5 млн кв.м агульнай плошчы, у тым ліку 2,5 млн кв. м — з дзяржаўнай падтрымкай. У 2014 годзе ў краіне плануецца ўвесці ў эксплуатацыю не менш за 8,5 млн кв.м жылых дамоў, а ў 2015 годзе — 9,5 млн кв.м.*

## НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 16° |
| Віцебск | + 15° |
| Гомель | + 21° |
| Гродна | + 17° |
| Магілёў | + 15° |
| Мінск | + 15° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.09.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8440,00 | ▲ |
| Еўра | 10570,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 260,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1039,41 | ▲ |

# ХРАМ КНІГІ — НЕВЫЧЭРПНАЯ КРЫНІЦА ДУХОЎНАСЦІ

## КРАІНЫ СНД АКТЫЎНА ЦІКАВЯЦЦА ВОПЫТАМ БЕЛАРУСІ ПА ПАДТРЫМЦЫ КНІГАВЫДАННЯ

**Аб гэтым у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА паведаміла першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч, каментуючы ў час 25-й Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу прадстаўленне Года кнігі ў Беларусі.**

«Адносіны да кнігі ў Беларусі — самыя зацікаўленыя, — сказала Лілія Ананіч. — А абвяшчэнне ў краіне цяперашняга Года кнігі закранула ўсе слаі беларускага грамадства, усе органы дзяржаўнага кіравання. Асабліва прыкметна, як павярнуліся тварам да беларускага кнігавыдання ўлады на месцах, якія праводзяць шэраг самых розных мерапрыемстваў у рамках Года кнігі. Усё гэта будзе садзейнічаць развіццю нацыянальнага кнігавыдання».

Першы намеснік міністра інфармацыі падкрэсліла, што пільная ўвага да праблем кнігавыдання ў Беларусі праяўляецца на самым высокім узроўні. Яна паведаміла, што падрыхтаваны праект указа кіраўніка дзяржавы па падтрымцы нацыянальнага кнігавыдання. Ва ўрадзе Беларусі рыхтуецца рашэнне аб дадатковых мерах па паляпшэнні камплектацыі школьных і публічных бібліятэк, каб кніга была максімальна даступна чытачам. Акрамя таго, нагадала Лілія Ананіч, парламент Беларусі ўжо прыняў у першым чытанні законапраект аб выдавецкай справе, які можа пачаць дзейнічаць ужо да канца гэтага года.

Гаворачы аб кнігавыданні ў Беларусі ў цэлым, Лілія Ананіч адзначыла, што яго тэмпы не зніжаюцца. За першае паўгоддзе 2012 года ў краіне выдадзена больш за 5 тыс. найменняў кніг агульным тыражом каля 18 млн экзэмпляраў. «Да канца года ў нас будзе выпушчана 4 новыя кнігі на кожнага жыхара Беларусі, беларусы застаюцца самай чытаючай нацыяй», — канстатавала першы намеснік міністра інфармацыі.

«Нам зайздросцяць у многіх краінах СНД, — сказала Лілія Ананіч. — Напрыклад, ва Украіне выпускаецца ў год толькі па адной кнізе на кожнага жыхара. Высокі ўзровень кнігавыдання ў Беларусі захаваўся дзякуючы таму, што дзяржава пастаянна аказвае гэтай сферы вялікую падтрымку».

## «НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ ЎВАСАБЛЯЕ ТЫП БІБЛІЯТЭКІ БУДУЧАГА»

**Такое меркаванне выказаў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік, ад імя беларускага ўрада віншуючы калектыў НББ з 90-годдзем з дня заснавання гэтай установы.**

«Дзякуючы рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы бібліятэчнай справы Нацыянальная бібліятэка Беларусі з'яўляецца гонарам краіны, вядучым культурным, інфармацыйным і грамадска-палітычным цэнтрам», — адзначыў Анатоль Тозік. Паводле яго слоў, дзяржава падтрымлівае развіццё бібліятэчнай і кнігавыдавецкай справы, выдзяляе сродкі на выпуск і закупку сацыяльна значнай літаратуры для папаўнення бібліятэчных фондаў. Акрамя таго, цяпер вядзецца работа па стварэнні Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі.

Анатоль Тозік уручыў супрацоўнікам НББ ганаровыя граматы Савета Міністраў.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў зачытаў віншаванне калектыву НББ, накіраванае Прэзідэнтам. У прыватнасці, у віншаванні гаворыцца, што за гады існавання бібліятэка прайшла вялікі і слаўны шлях, унесла важкі ўклад у станаўленне і развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы незалежнай беларускай дзяржавы. Надзвычай важнай падзеяй стала адкрыццё новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, які даў ёй магчымасць стаць адной з лепшых нацыянальных бібліятэк свету, месцам, дзе праходзяць грамадска-палітычныя мерапрыемствы міжнароднага ўзроўню.

Аляксандр Радзькоў уручыў супрацоўнікам бібліятэкі ганаровыя граматы Адміністрацыі Прэзідэнта.

Міністр культуры Павел Латушка ў сваю чаргу ўзнагародзіў ганаровай граматай Міністэрства культуры калектыў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Асобным супрацоўнікам уручаны нагрудныя знакі гэтага ведамства.

**БЕЛТА.**

## ПРАДУКЦЫЯ — ПА ПРЫМАЛЬНЫХ ЦЭНАХ

**Прадукцыя на традыцыйных сельскагаспадарчых кірмашах у Мінску будзе рэалізоўвацца па прымальных цэнах, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

15 верасня з 9 да 17 гадзін каля сталічнага Палаца спорту (пр. Пераможцаў, 4) адбудзецца цэнтральны сельскагаспадарчы кірмаш з удзелам перапрацоўчых арганізацый, прадпрыемстваў-вытворцаў, фермерскіх гаспадарак, рыбгасаў, гандлёвых прадпрыемстваў, а таксама грамадзян, якія вырасцілі прадукцыю на сваіх прысядзібных участках.

Паводле слоў спецыялістаў, для ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны будзе арганізавана бясплатная дастаўка плодаагародніннай прадукцыі. Шырокі асартымент рэалізуемай прадукцыі, высокая якасць, прымальныя цэны, культурная музычная праграма мастацкіх калектываў сталіцы створыць добры настрой наведвальнікам кірмашоў і забяспечыць ім прыемны адпачынак, адзначылі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

Кожную суботу з 15 верасня да 10 лістапада бягучага года на кірмашах ва ўсіх раёнах Мінска можна будзе купіць разнастайны асартымент плодаагародніннай прадукцыі па цэнах ніжэйшых, чым у прадпрыемствах гандлю і на рынках Мінска: бульбу, капусту, буракі, моркву, цыбулю, яблыкі, грушы, гарбузы, кабачкі, рэдзьку, баклажаны, таматы, агуркі, часнок, журавіны, мёд, плодаагародніннную кансерваваную прадукцыю, а таксама іншыя харчовыя тавары; мяса і мясныя паўфабрыкаты, каўбасныя вырабы і вэнджаніну, малочную прадукцыю, хлебабулачныя і кандытарскія вырабы, сажалкавую і рачную рыбу.

Адміністрацыямі раёнаў горада вызначана 138 пляцовак для рэалізацыі плодаагародніннай прадукцыі з аўтамашын і латкоў у месцах, набліжаных да жылых раёнаў. Яны пачнуць функцыянаваць з 8 верасня бягучага года, падкрэслілі ў Мінгарвыканкаме.

**БЕЛТА.**

## ГАСЦІНІЦА СА 125-ГАДОВАЙ ГІСТОРЫЯЙ ЗНОЎ АДКРЫЛАСЯ Ў МІНСКУ

**Трохзоркавая гасцініца «Гарні» адкрылася ўчора ў цэнтры Мінска.**

Гэта адзіная гасцініца ў Мінску, узноўленая ў інтэр'ерах XIX стагоддзя. Да гістарычнага акцэнту абавязвае месцазнаходжанне: будынак, у якім знаходзіцца «Гарні», быў пабудаваны ў 1887 годзе. У канцы XIX стагоддзя купец Берка Суцін адкрыў тут мэбляваныя пакоі «Маччыз», у якіх маглі пераначаваць пастаяльцы. Пры рэстаўрацыі гасцініцы атмасфера эпохі была адноўлена з максімальнай дакладнасцю.

**Ул. інф.**

## САМІМ ПАГЛЯДЗЕЦЬ І ГАСЦЯМ ПАКАЗАЦЬ

**У Быхаўскім раёне ўлады аб'явілі спаборніцтва па добраўпарадкаванні, прымеркаванае да «Дажынак-2012».**

У спаборніцтве бяруць удзел чатыры сельсаветы — Баркалабаўскі, Абідавіцкі, Следзюкоўскі і Чарнаборскі. Менавіта яны месцяцца ўздоўж аўтамабільных трас, па якіх паедуць госці рэспубліканскага свята працаўнікоў вёскі, і павінны зрабіць на іх добрае ўражанне. Акрамя ўласна добраўпарадкавання, аўтарытэтнае журы ўлічыць у сваіх адзнаках, напрыклад, правядзенне адзінага санітарнага дня, ліквідацыю безгаспадарных аб'ектаў, утрыманне могілак і нават барацьбу з пустазеллем. Сельсавет, які прызнаюць лепшым, атрымае прыз у 100 базавых велічынь — 10 мільёнаў рублёў.

**Ілона ІВАНОВА.**

# АДНА З ЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

**Аб гэтым заявіў учора міністр культуры Павел Латушка на адкрыцці міжнароднага кангрэса «Нацыянальная бібліятэка як феномен культуры», прысвечанага 90-годдзю НББ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

НББ цесна звязана з гісторыяй краіны. «Шлях, які прайшла бібліятэка, — гэта прыклад самаадданага служэння беларускаму народу, ідэалам дабра і гуманізму. Роля бібліятэкі ў захаванні і развіцці ўнікальнага інфармацыйнага рэсурсу краіны надзвычай важная», — лічыць міністр культуры.

На яго думку, НББ уяўляе сабой новы тып сучаснай бібліятэкі, знаходзіцца ў шэрагу лепшых бібліятэк свету, з'яўляецца адным з сімвалаў беларускай дзяржаўнасці і візітнай карткай Мінска.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЕСТКІ З КНДР УСТРЫВОЖЫЛІ СВЕТ: ПРАВАДЫР РЫХТУЕ ЗМЕНУ КУРСУ?

Нечаканая аб'ява паўночнакарэйскага інфармацыйнага агенцтва ЦТАК аб правядзенні ў КНДР пазачарговай сесіі Вярхоўнага народнага сходу краіны спарадзіла ў Сеуле і Токіа здагадкі аб магчымых паваротах у палітыцы Пхеньяна, паведамляе ІТАР-ТАСС. Паводле звестак афіцыйнага паўночнакарэйскага агенцтва, сесія адбудзецца 25 верасня, аднак яе парадак дня да гэтага часу невядомы. Звычайна сесія паўночнакарэйскага парламента праводзіцца толькі раз на год, і на ёй, у першую чаргу, абмяркоўваецца бюджэт краіны на будучы год. Аднак сёлета яна ўжо адбылася ў красавіку. Менавіта тады новы лідар краіны Кім Чэн Ын быў прызначаны на пасаду першага старшыні Дзяржаўнага камітэта абароны. Між тым у свеце навіну аб новай сесіі ўрада КНДР звязваюць, у прыватнасці, з паведамленнямі пра гаспадарчыя пераўтварэнні, якія нібыта рыхтуюцца ў краіне.

### ПРЭМ'ЕР ІЗРАІЛЯ АДМЯНІЎ ПАСЯДЖЭННЕ КАБІНЕТА, ВЫЯВІЎШЫ ЗДРАДНІКА

Прэм'ер-міністр Ізраіля Беньямін Нетаньяху адмяніў пасяджэнне кабінета па абароне і бяспецы краіны ў сераду, 5 верасня. Ён паведаміў, што адзін з членаў кабінета перадаў у СМІ сакрэтную інфармацыю з папярэдняга пасяджэння, якое адбылося ў аўторак, здрадзіўшы тым самым інтарэсам нацыі, паведамляе сайт ізраільскі газеты Yedioth Ahronoth, якая раней і апублікавала ўцечку сакрэтных звестак. «Неўзабаве пасля ўчарашняга пасяджэння кабінета адбылася недапушчальная ўцечка інфармацыі», — заявіў Нетаньяху на пасяджэнні кабінета перад яго роспускам. «Бяспека дзяржавы і яе грамадзян залежыць ад магчымасці кабінета праводзіць закрытыя пасяджэнні. Гаворка ідзе аб асноўным інструменце кантролю бяспекі дзяржавы. Учора нехта нанёс вялікую шкоду даверу, які аказваюць грамадзяне Ізраіля кабінету. Акрамя гэтага нанесены ўрон рэпутацыі ўсіх, хто прымаў удзел у пасяджэнні», — сказаў прэм'ер-міністр Ізраіля.

По словах Нетаньяху, праводзіць новае пасяджэнне да выяўлення крыніцы ўцечкі было б безадказна.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### УРАД ЯПОНІІ ВЫРАШЫЎ КУПІЦЬ АСТРАВЫ, ЗА ЯКІЯ СПРАЧАЕЦЦА З КІТАЕМ, ЗА 26 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

**Японскі ўрад змог дамовіцца з прыватным уладальнікам астравоў Сенкаку ва Усходне-Кітайскім моры аб куплі трох з пяці астравоў архіпелага за 2 мільярды іен (каля 26,1 мільёна долараў), сцвярджае газета «Іаміуры сімбун».**



Сам дагавор куплі-продажу пакуль не складзены, аднак, згодна з паведамленнямі японскіх СМІ, урад Японіі мае намер завяршыць здзелку ўжо на працягу гэтага месяца, падкрэслівае РІА «Навіны». Мяркуецца, што японскі бок спачатку выплаціць сапраўднаму ўладальніку астравоў — сям'і Курыхара — неабходную суму, а затым аб'явіць аб іх нацыяналізацыі і паставіць у вядомасць Кітай.

Пры гэтым, улічваючы складанае фінансавае становішча, у якім зараз знаходзіцца ўрад японскага прэм'ер-міністра Ёсіхіка Ноды, грошы на куплю астравоў Сенкаку будуць узятыя з рэзервовага фонду, удакладняе ІТАР-ТАСС. Акрамя таго, чакаецца, што ўжо сёння адбудзецца сустрэча паміж прадстаўнікамі цэнтральнай улады і губернатарам Токіа Сінтара Ісіхарай, які першапачаткова меў намер купіць гэтыя астравы для сваёй прэфектуры.

## КОРАТКА

Беларусь і Ізраіль пабудуюць у Мінску або яго наваколлі цэнтр развіцця і ўкаранення высокіх і новых тэхналогій у аграпрамысловы комплекс.

Беларускія лёгкаатлеты прайгралі лонданскую Алімпіяду метадычна і фармакалагічна. З такой заявай выступіў падчас дакладу на сумеснай калегіі Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнага алімпійскага камітэта выконваючы абавязкі галоўнага трэнера зборнай Беларусі па лёгкай атлетыцы Аляксандр Трашчыла.

Міжнародная федэрацыя футбола (ФІФА) апублікавала чарговы рэйтынг зборных. Каманда Беларусі, як і ў жніўні, займае 76-е месца, маючы 443 ачкі. За мінулы месяц падапечныя Георгія Кандрацьева правялі толькі адзін таварыскі матч, перамогшы ў гасцях зборную Арменіі.

Торт-рэкардсмен даўжынёй больш за 24 м і вагой 727 кг спяклі ўчора ў Мінску. Гэты кандытарскі выраб стаў не толькі самым вялікім у Беларусі, але і зарэгістраваны ў арганізацыі кнігі рэкордаў СНД, Балтыі і Расіі «Дзіва».

Арганізацыі канцэрна «Беллегпрам» забяспечылі пастаўкі на ўнутраны рынак адзення і абутку для школьнікаў у поўным аб'ёме.

## ЦІ НАВУЧЫЛІСЯ ВЫ ЭКАНОМІЦЬ? НА ЧЫМ?



**Кацярына ЦІМАШЭНКАВА, галоўны аграхімік Шаркаўшчынскага раёна:**

— Эканоміць я, напэўна, не ўмею. Лічу, што трэба жыць сёння і цяпер. Калі ёсць грошы, трэба не складаць іх, а ўкладаць у дзяцей, у падарожжы. Часам, як без гэтага, адкладаю грошы, каб пасля парадаваць блізкіх — зрабіць ім падарунак альбо дапамагчы сыну. Праўда, цяпер мой сын ужо дастаткова самастойны. Ён мае тры адукацыі. Пакуль вучыўся, я яму матэрыяльна дапамагала. Хоць ён і сам працаваў, але мне, як любой маці, хацелася яго падтрымаць. Цяпер збіраю грошы на адпачынак. Хацелася б паглядзець свет. Як і любая гаспадыня, займаюся нарыхтоўкамі на зіму — салацікі розныя, кампоцікі — каб было чым здзівіць гасцей. Ніколі не падлічвала, ці вялікая гэта эканомія, але ведаю адно: мае закруткі дзеці больш любяць, чым куплёныя.



**Міхась СЛІЗКІ, загадчык музея гармонікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:**

— Эканомлю на папяросах і гарэлцы. Проста таму, што не палю і не п'ю. Зэканомленыя грошы трачу на сваё захапленне — я ўжо больш як 20 гадоў калекцыяніраю гармонікі. Вось і нядаўна тэлефанаваў мне адзін чалавек з Брэста, хоча перадаць у музей стары нямецкі акардэон. Ён ва ўзросце, у Мінск яму цяжка пад'ехаць.Таму буду думаць, на чым забраць прэзент. Таксама эканомлю на праездзе. Бензін дарагі, таму езджу на грамадскім транспарце. Маю праязны на аўтобус, тралейбус і метро. Гэта больш выгадна, чым па некалькі разоў на дзень набываць талончык у кандуктаркі. Бо ў пошуках інструментаў для калекцыі мне даводзіцца шмат калясіць па горадзе.



**Таццяна КРЫШТАЛЬ, бухгалтар ГА «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў»:**

— Я атрымліваю ў месяц 2 мільёны рублёў з улікам павышэння пенсіі па інваліднасці і зарплаты. Лепш бы спыталіся: «Таццяна, як вы выжываеце на гэтыя грошы?» (*смяецца*). Так што хочаш не хочаш, а эканоміць трэба. Эканомлю на ежы. Набываю са зніжкамі прадукты і гатую сама. Набываю звычайную муку, а не гатовую сумесь для блінчыкаў, не фарш, а мяса, з якога сама раблю фарш. Летам і восенню прасцей, бо памідорамі і агуркамі нас з дачкой забяспечвае мама са свайго агарода. Вопратку набываю не ў буціках за шалёныя грошы, а на рынку, у «стоку» ці сэканд-хэндзе. Там, дарэчы, можна знайсці даволі якасныя і прыгожыя рэчы. Не эканомлю на дачцэ, на яе адукацыі. Яна ходзіць у школу, ёй трэба вітаміны, таму стараюся, каб штодзень ела садавіну, агародніну. Не эканомлю на бензіне, бо мне трэба шмат ездзіць, каб зарабляць грошы.

**Надзея ДРЫЛА.**

# БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ПАШЫРЭННІ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА З В'ЕТНАМАМ

**Аб гэтым заявіў 5 верасня прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з прэзідэнтам В'етнамскай акадэміі навук і тэхналогій Цьяу Ван Мінем, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

І ў Беларусі, і ў В'етнаме сёння чакаюць вялікай аддачы ад навукі, і ў сферы прыкладных навуковых даследаванняў, і ў галіне прарыўных тэхналогій. Беларусь выконвае мноства інавацыйных праектаў, у тым ліку ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы. Міхаіл Мясніковіч нагадаў аб дамоўленасці з расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым аб стварэнні рабочых груп, якія працуюць над прынцыпова новымі прарыўнымі навуковымі напрамкамі. «Таму супрацоўніцтва з намі — гэта супрацоўніцтва і з расійскімі, а таксама казахстанскімі вучонымі», — падкрэсліў ён.

Прэм'ер-міністр таксама адзначыў, што ў бліжэйшы час у Беларусі адбудзецца пасяджэнне навукова-кансультатыўнага савета «Сколкава». У Беларусь на гэта мерапрыемства прыедуць вядучыя расійскія вучоныя.

Кіраўнік урада выказаў упэўненасць, што цяперашні візіт прэзідэнта В'етнамскай акадэміі навук і тэхналогій у Мінск стане новай старонкай у двухбаковым навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што з прэм'ер-міністрам В'етнама абмяркоўвалася пытанне аб падрыхтоўцы дакумента аб зоне свабоднага гандлю Мытнага саюза і В'етнама як ключавой краінай АСЕАН. «Лічу, што пашырэнне нашых інтарэсаў на прастору Паўднёва-Усходняй Азіі будзе паспяховым і супрацоўніцтва з вамі будзе гэтаму садзейнічаць», — заявіў ён.

У сваю чаргу Цьяу Ван Мінь адзначыў, што апошнія гады В'етнамская акадэмія навук і тэхналогій сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі дасягнулі вялікіх поспехаў у рэалізацыі сумесных праектаў, падрыхтоўцы кадраў, укараненні вынікаў навуковых даследаванняў вытворчасці. «Мы лічым, што для больш эфектыўнага супрацоўніцтва дзвюх акадэмій неабходна больш дапамогі з боку дзяржавы», — сказаў ён.

**БЕЛТА.**

# АДНА З ЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Павел Латушка нагадаў, што бібліятэка асвоіла прагрэсіўны метад работы з электроннымі носьбітамі інфармацыі, паспяхова выкарыстоўвае інавацыйныя формы бібліятэчнага абслугоўвання, аператыўна і якасна задавольвае ўніверсальныя інфармацыйныя патрабаванні карыстальнікаў у інтарэсах айчыннай навукі, эканомікі, вытворчасці, культурнай і духоўнай сфер. Імкнучыся адпавядаць патрабаванням сучаснага інфармацыйнага грамадства, НББ стала адным з ініцыятараў буйнамаштабнага праекта па стварэнні Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі, рэалізацыя якога актыўна пачынаецца з гэтага года.

Паводле слоў Паўла Латушкі, сімвалічна, што юбілей галоўнай бібліятэкі краіны адзначаецца ў 2012 годзе, які на рэспубліканскім узроўні аб'яўлены Годам кнігі. Менавіта кніга і асветніцтва калісьці сталі асновай развіцця бібліятэк, якія на працягу стагоддзяў з'яўляюцца важнейшым складальнікам нацыянальнай культуры, адным з галоўных прыярытэтаў сацыяльнага развіцця краіны. Стагоддзямі бібліятэкі на беларускай зямлі служаць справе асветніцтва, развіццю роднай мовы, умацаванню нацыянальнай культуры, павышэнню культурнага і навуковага патэнцыялу нацыі, атрыманню ведаў аб развіцці свету. Бібліятэкі ажыццяўляюць





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

інфармацыйнае забеспячэнне сучаснага грамадства, ураўноўваюць магчымасці ўсіх жыхароў рэспублікі на доступ да інфармацыі і ведаў, ствараюць адзіную інфармацыйна-культурную прастору. Прызнаючы вялікую ступень уплыву бібліятэк на развіццё ўсіх сфер жыцця грамадства і адчуваючы сацыяльна-эканамічны эфект ад іх дзейнасці, беларуская дзяржава ажыццяўляе і будзе ажыццяўляць паслядоўную і мэтанакіраваную палітыку па развіцці бібліятэчнай справы, падкрэсліў міністр культуры.

Ён таксама дадаў, што нацыянальныя бібліятэкі ва ўсім свеце выконваюць асаблівую функцыю, таму іх падтрымцы ўдзяляецца асаблівая ўвага з боку дзяржавы. Кангрэс, які праходзіць у Мінску, яшчэ раз звяртае ўвагу на значнасць нацыянальнай бібліятэкі, яе выключную ролю ў захаванні і развіцці культуры.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў форуму звярнуўся намеснік генеральнага дырэктара ЮНЕСКА па пытаннях камунікацыі і інфармацыі Яніс Карклінь.

Кангрэс, які прадоўжыцца да 7 верасня, сабраў больш за 400 удзельнікаў з 30 краін. Сярод запрошаных — спецыялісты з Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Малдовы, Азербайджана, Казахстана, Узбекістана, Грузіі, Балгарыі, Венгрыі, Македоніі, Румыніі, Сербіі, Славакіі, Славеніі, Харватыі, Даніі, Францыі, Італіі, Швецыі, Амана, Турцыі, Ірана, ЗША.

Арганізатарамі кангрэса выступілі Міністэрства культуры Беларусі, Арганізацыя аб'яднаных нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Бібліятэчная асамблея Еўразіі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж». Генеральны партнёр кангрэса — ААТ «Банк БелЗЭБ».

## АБЗАЦ

**◢ На пажары ў Шуміліне загінулі тры чалавекі. Аб узгаранні ў доме па вул. Луначарскага апоўначы паведаміў грамадзянін, які праязджаў міма. Выратавальнікі прыехалі праз 3 хвіліны. Дом быў поўны дыму, гарэў шыферны дах. Людзям, якія знаходзіліся ўнутры, дапамагчы было ўжо немагчыма. Загінулі гаспадыня дома — пенсіянерка, яе сужыхар і знаёмы жанчыны. Мяркуецца, што прычынай стала неасцярожнасць пры курэнні аднаго з мужчын.**

◢ Восы напалі на дзяцей у адным з дзіцячых садкоў Гомеля, пасля чаго пяцёра малых былі дастаўлены ў Гомельскую абласную клінічную бальніцу. НЗ адбылося 3 верасня. Дзеці гулялі на пляцоўцы і, капаючыся ў пясочніцы, натыкнуліся на асінае гняздо. Рой насякомых накінуўся на дзяцей. Выратавальнікі знішчылі гняздо. Траіх дзяцей выпісалі праз непрацяглы час, двое іншых працягвалі лячэнне.

**◢ У Смалявіцкім раёне работнік зернесушыльнага комплексу ААТ «Смалявіцкі райаграсэрвіс» разам з саўдзельнікамі скралі 48,6 т зерня, што належала гаспадарцы. Прама з бункераў зернесушылкі яны ссыпалі зерне ў грузавы аўтамабіль, адкуль ноччу перавозілі ў будуемы дом у Смалявіцкім раёне. Дом належыць аднаму з падазроных. Там пшаніцу і ячмень фасавалі ў мяхі.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ



◢ 48-гадовая жыхарка Мельбурна (Аўстралія), у якой ужо ёсць 12 дзяцей, нарадзіла адразу пяцярых блізнят. Зачацце адбылося натуральным шляхам, але роды прайшлі з дапамогай кесарава сячэння. Аўстралійка нарадзіла двух хлопчыкаў і трох дзяўчынак. На жаль, адна дзяўчынка нарадзілася мёртвай. Удзел у родах прымала каманда з 30 урачоў. Гэта першы выпадак нараджэння пяцярых блізнят за апошнія 30 гадоў у Мельбурне. Сям'я, цяпер ужо з 16 дзецьмі, стала адной з самых вялікіх у аўстралійскім штаце Вікторыя.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

■ Факт

## СЕЗОН БЕЗ ГРЫПУ

**Сёлета ў Магілёўскай вобласці плануецца прышчапіць ад грыпу траціну насельніцтва. Ужо на пачатку верасня ў медыцынскія ўстановы рэгіёна паступяць першыя вакцыны. Закупленыя за бюджэтныя сродкі, яны будуць кітайскай і расійскай вытворчасці.**

Можна будзе платна зрабіць прышчэпку больш дарагімі французскай ці бельгійскай вакцынамі. Групы рызыкі, як і раней, будуць прышчапляцца бясплатна. Прадпрыемствы паклапоцяцца пра сваіх работнікаў і іх здароўе. Спецыялісты лічаць вакцынацыю найбольш эфектыўнай прафілактыкай грыпу. У школах ужо цяпер на бацькоўскіх сходах нагадваюць пра кампанію па вакцынацыі і раяць зрабіць выбар на карысць прышчэпак.

Людзі, як вядома, ставяцца да прышчэпак ад грыпу па-рознаму: адны лічаць гэта адзіным дзейсным сродкам абараніцца ад грознай хваробы і яе наступстваў, іншыя аддаюць перавагу традыцыйным спосабам умацавання імунітэту — аздараўленню і фізічнай культуры. Аднак праўда, што летась эпідэмію грыпу ў Магілёве так і не аб'явілі, і медыкі лічаць, што станоўчую ролю адыграла ў тым ліку і шырокая і своечасовая вакцынацыя насельніцтва.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ГРУНТ ПРАСЕЎ, КРАН ПЕРАКУЛІЎСЯ

**У Мінскім раёне перакуліўся аўтамабільны кран грузападымальнасцю 50 тон.**

— Адбылося гэта здарэнне бліжэй да заканчэння працоўнага дня ў вёсцы Баравая. На тэрыторыі таварыства з абмежаванай адказнасцю «Будтур» перакуліўся кран, які належаў замежнаму прадпрыемству «Туртрансkомпані», — паведаміў галоўны спецыяліст цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Аляксей Рак. — На гэты момант ён не эксплуатаваўся, мантаж будаўнічых канструкцый не вёўся (страла на 37 метраў была высунутая толькі на адно калена), таму пацярпелых не было. Мяркуецца, што прычына перакульвання — прасяданне грунту пад апорай крана.

## ДАРАГІЯ «МАБІЛЬНЫЯ» СЯДЗЕННІ...

**Пасля праходжання пашпартнага кантролю ў пункце пропуску «Варшаўскі мост» кіроўца аўтамабіля «Фольксваген Пасат» прад'явіў супрацоўніку мытні пасажырскую дэкларацыю, у якой указаў звесткі пра планшэтны камп'ютар iPad, які ўвозіць. Аднак, як высветлілася, гэта былі далёка не ўсе тавары, якія знаходзіліся ў транспартным сродку...**

Як распавялі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, падчас правядзення мытнага агляду ў машыне былі знойдзены 24 дарагія тэлефоны iPhone 4S 16GB. Кіроўца перад праходжаннем мяжы старанна схаваў іх: 20 тэлефонаў знаходзіліся ў спінках сядзенняў, яшчэ 4 — за абшыўкай кузава.

Па факце правапарушэння распачаты адміністрацыйны працэс. Мабільныя тэлефоны коштам звыш 140 мільёнаў рублёў, а таксама аўтамабіль коштам каля 60 мільёнаў рублёў канфіскаваны да рашэння суда.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

# СКАРАЦІЦЬ АДСТАВАННЕ АД ЕЎРОПЫ



**Прамысловасць Беларусі да 2020 года павінна скараціць у два разы сваё адставанне ад сярэднееўрапейскага ўзроўню па росце прадукцыйнасці працы па дабаўленай вартасці. Такая задача пастаўлена ў Праграме развіцця прамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь, якая была нядаўна прынята Саветам Міністраў. Пра мэты і задачы праграмы журналістам расказаў Юрый ЧАБАТАР, начальнік галоўнага ўпраўлення прамысловасці, транспарту і сувязі Мінэканомікі. Па яго словах, новая праграма стала лагічным працягам праграмы развіцця прамысловага комплексу з 1998 года:**

— Той дакумент адыграў сваю ролю — за гэты час сярэдні тэмп прамысловай вытворчасці склаў у нас 108,5%. Нехта можа сказаць, што гэта мала ў параўнанні з Кітаем ці іншымі азіяцкімі краінамі, але большасць краін Еўрасаюза лічыць за шчасце 2-3-працэнтны рост.

Прадстаўнік Мінэканомікі расказаў, што ў мінулай праграме асноўнай мэтай з'яўлялася захаванне ўсяго таго, што засталося ў спадчыну ад Савецкага Саюза. А зараз «тыя выклікі і рызыкі, якія нясе знешні контур, вымусілі нас прааналізаваць становішча прамысловасці і заняцца распрацоўкай новай праграмы».

— Сёння, нягледзячы на высокія тэмпы і поспехі за мінулыя гады, беларуская прамысловасць пакуль адстае ад развітых краін. Калі параўноўваць па ключавым паказчыку — прадукцыйнасці па дабаўленай вартасці, то мы адстаём ад Еўрасаюза амаль у чатыры разы. Па-другое, у нашай прамысловасці пераважае традыцыйны сектар. Для параўнання, калі ў кранах ЕС высокатэхналагічны сектар займае 15%, то ў нас — 2-3%. Наступная праблема — гэта вялікая рэсурсаёмістасць нашай прамысловасці (матэрыялаёмістасць, энергаёмістасць і імпартаёмістасць). Ну і, безумоўна, трэба павышаць эфектыўнасць кіравання прамысловасцю.

Прадстаўнік Мінэканомікі расказаў, якім чынам, згодна з праграмай, будуць вырашацца абазначаныя праблемы. Перш за ўсё плануецца зрабіць структурныя пераўтварэнні: пастаўлена задача карэннай мадэрнізацыі дзейных прадпрыемстваў для павышэння прадукцыйнасці працы. Наступныя кірункі — развіццё паліўна-энергетычнага комплексу (куды ўваходзяць будаўніцтва АЭС і павелічэнне выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі), развіццё высокатэхналагічнага сектара эканомікі, а таксама ўдасканаленне кіравання прамысловасцю. Дарэчы, калі казаць пра апошні кірунак, то пэўныя захады ўжо робяцца:

— У адрозненне ад іншых краін, у нас прамысловасць курыруюць каля васьмі міністэрстваў і канцэрнаў. У тых жа Расіі ці ва Украіне — 1-2 міністэрствы. Таму ў праграме прадугледжаны паступовы адыход ад непасрэднага кіравання прадпрыемствамі. Зроблена гэта будзе праз давядзенне паказчыкаў менавіта на аснове ўладання ўласнасцю. Гэты этап пачаўся: ідзе ўзбуйненне, стварэнне карпаратыўных структур — я маю на ўвазе стварэнне холдынгаў. Задача холдынгаў — разгрузіць нашых міністраў ад бягучай працы па кіраванні прадпрыемствамі. Іх асноўнай задачай павінна стаць стратэгічнае бачанне развіцця галіны, прыцягненне стратэгічных інвестараў. А ўся бягучая праца павінна засяродзіцца ў карпаратыўных структурах. Пасля завяршэння гэтага этапу, калі мы ўбачым эфектыўнасць, будзе пераход да стварэння Міністэрства прамысловай палітыкі.

Юрый Чабатар таксама адзначыў, што праграмай прадугледжваецца развіццё малога бізнэсу — яго доля ў прамысловасці павінна дасягнуць 25%. А асобны раздзел прысвечаны знешнім фактарам і рызыкам, дзе «вывучаны магчымыя праблемы, з якімі мы можам сутыкнуцца, — гэта паўтарэнне рэцэсій і крызісаў у свеце, у тым ліку і ў прамысловым сектары». З імі, як кажа Юрый Адамавіч, у праграме прапануецца змагацца праз асваенне новых рынкаў і замацаванне на ўжо існуючых, а таксама стварэнне сумесных прадпрыемстваў і размяшчэнне матэрыялаёмістых вытворчасцяў у іншых краінах, што найбольш актуальна для машынабудаўнічага комплексу.

У выніку рэалізацыі праграмы, як мяркуецца, да 2020 года адставанне Беларусі ад краін Еўрасаюза па прадукцыйнасці працы павінна скараціцца ў 2 разы, а ў высокатэхналагічных навукаёмістых відах дзейнасці, якія выкарыстоўваюць айчынную сыравінную базу, ставіцца задача ўшчыльную наблізіцца да прадукцыйнасці працы па валавай дабаўленай вартасці да сярэдняга ўзроўню ЕС.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЗНОЎ ПАДПАЛІЛІ?

**За апошні час гэта ўжо далёка не першы выпадак, калі на палях гараць сцірты саломы. Мяркуецца, што прычына такіх пажараў — падпал.**

Чарговае здарэнне з гэтага разраду адбылося ўначы паблізу вёскі Міхейкі: слуцкім пажарным-выратавальнікам паведамілі, што там нешта гарыць. Ужо на месцы работнікі МНС убачылі, што гэтае «нешта» — сцірта саломы памерам 5х60 метраў. У выніку, як мяркуецца, падпалу агонь знішчыў 150 тон саломы, якая належала філіялу «Наша Ніва» ААТ «Слуцкі мясакамбінат». Вінаватыя асобы ўстанаўліваюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КАЛЯРОВЫ МЕТАЛ НЕ ДАЕХАЎ ДА РАСІЙСКАЙ МЯЖЫ

**Буйную партыю каляровага металу затрымалі супрацоўнікі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці.**

У Крычаўскім раёне быў спынены мікрааўтобус «Мерседэс», якім кіраваў 46-гадовы жыхар раённага цэнтра. Ён спрабаваў вывезці ў Расію 2,3 тоны каляровага металу на суму 19 мільёнаў рублёў, але дакументаў на нарыхтоўку лому і яго транспарціроўку не меў.

Тым часам у Магілёве у гаражным масіве затрымалі двух гараджан. Яны грузілі каляровы метал у мікрааўтобус «Фіят». Нелегальны груз заважыў 6,8 тоны — на суму 230 мільёнаў рублёў.

— Цяпер кошт скупкі лома каляровага металу на нарыхтоўчых пунктах у Расійскай Федэрацыі вышэйшы, чым у Беларусі, і гэта з'яўляецца прычынай яго нелегальнага вывазу, — растлумачыў намеснік начальніка ўпраўлення ДФР КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр Шаройкін. І нагадаў, што парушальнікам пагражае не толькі канфіскацыя металу, але і немаленькі штраф — ад 10 да 30 базавых велічынь.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «ФАЛЬКСВАГЕН» З ЦЫГАРЭТАМІ

**Ноччу супрацоўнікі ДАІ Верхнядзвінскага раённага аддзела ўнутраных спраў разам з пагранічнікамі на аўтадарозе Дрэтунь—Дзісна—Празарокі паблізу вёскі Барковічы Верхнядзвінскага раёна затрымалі аўтамашыну «Фальксваген-Гольф», у якой без адпаведных суправаджальных дакументаў вадзіцель перавозіў больш за 4,2 тысячы пачкаў цыгарэт беларускай вытворчасці.**

У дачыненні да кіроўцы быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні. Цыгарэты на суму 16,7 мільёна рублёў канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПЯШЧОТНЫЯ АДНОСІНЫ

**У Светлагорску 40-гадовая жанчына не далічылася 20 тысяч долараў, якія знаходзіліся ў кватэры пасля продажу нерухомасці.**

Калі да пошуку падключыліся праваахоўнікі, высветлілася, што грошы выкраў малады сужыцель грамадзянкі. Падчас следства стала зразумела, што 31-гадовы мужчына напярэдадні вывез жанчыну на адпачынак, а сам вярнуўся і здзейсніў крадзеж. Выкрадзеная валюта была знойдзена ў службовым аўтамабілі каханага.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПАЕЗДАЧКА АТРЫМАЛАСЯ «НЯТАННАЙ»

**Прыватная паездка чыгуначным транспартам грамадзяніна нашай краіны ў Германію праз «Брэст-Цэнтральны» каштавала яму 16 150 еўра...**

— Едучы цягніком Масква — Парыж, грамадзянін заявіў супрацоўніку мытні, што правозіць толькі асабістыя рэчы, а тавараў і грашовых сродкаў, якія трэба пісьмова дэклараваць, у яго няма. На прапанову супрацоўніка мытні ўсё ж прадаставіць да афармлення тавары, што перамяшчаюцца, той прад'явіў 3,3 тысячы еўра і 1 тысячу долараў ЗША, — сказалі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта. — Аднак падчас агляду ручной паклажы высветлілася, што сярод асабістых рэчаў знаходзіцца яшчэ 20 тысяч еўра. Такім чынам, пасажыр перавозіў праз мяжу 23,3 тысячы еўра і 1 тысячу долараў. А згодна з мытным заканадаўствам, грашовыя сродкі на агульную суму, якая перавышае ў эквіваленце 10 тысяч долараў, павінны дэклaравацца ў пісьмовай форме шляхам падачы пасажырскай мытнай дэкларацыі. Адмовіўшыся ад гэтай працэдуры, грамадзяніну давялося «адмовіцца» і ад гэтай сумы: 16 150 еўра былі канфіскаваны. У дачыненні да грамадзяніна складзены адміністрацыйны пратакол. Лёс канфіскаванай валюты вырашыць суд Маскоўскага раёна г. Брэста.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Аналітычны прагноз

# КАДРАВЫЯ РАШЭННІ І ПАЛІТЫЧНЫ РЭАЛІЗМ

**Канец жніўня ў Беларусі быў адзначаны знакавымі кадравымі прызначэннямі. А на Дзень ведаў Прэзідэнт краіны зрабіў шэраг не менш важных і паказальных заяў, якія пацвярджаюць, што галоўным фактарам палітычных змен у 2012—2013 гадах застаецца глабальны крызіс.**

За прызначэннем Уладзіміра Макея на пасаду міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь было рашэнне кіраўніка дзяржавы аб тым, што кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта стане былы пасол Беларусі ў Расіі Андрэй Кабякоў. У сваю чаргу Андрэй Уладзіміравіч прапанаваў прызначыць афіцыйным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі першага намесніка міністра замежных спраў Ігара Петрышэнку.

Калі патэнцыяльны будучы пасол у Расіі з'яўляецца кадравым дыпламатам і фігурай у добрым сэнсе тэхнічнай і выканальніцкай, то першыя два прызначэнцы з'яўляюцца, безумоўна, палітычнымі фігурамі. Іх прыход на пасады з'яўляецца лагічным і накіраваным на рашэнне канкрэтных задач, якія стаяць перад краінай ва ўмовах глабальнага крызісу.



Андрэй Кабякоў як віцэ-прэм'ер займаўся, перш за ўсё, эканамічнымі пытаннямі і пытаннямі інтэграцыі Беларусі ў Мытны саюз і Адзіную эканамічную прастору. Адпаведна, яго прызначэнне падкрэслівае стратэгічнае значэнне для беларускага кіраўніцтва інтэграцыйных працэсаў. Прычым цэнтр прыняцця рашэнняў па пытаннях інтэграцыі шмат у чым рухаецца ад урада ў Адміністрацыю Прэзідэнта. У гэтым плане прызначэнне Сяргея Румаса, старшыні праўлення ААТ «Нацыянальны банк развіцця», «пазаштатным» віцэ-прэм'ерам па пытаннях інтэграцыі таксама ўкладаецца ў тэндэнцыю канцэнтрацыі стратэгічна важных «інтэграцыйных» паўнамоцтваў па-за ўрадам. А ўрад, перш за ўсё ў асобе Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь, будзе рэалізоўваць той курс, які вызначаецца інтэграцыйнымі працэсамі ўнутры краіны ў форме канкрэтных змен эканамічнай, бюджэтнай, фінансава-крэдытнай палітыкі.

У сваю чаргу, ва ўмовах узмацнення інтэграцыйнага ўсходняга вектара Рэспублікі Беларусь на новага міністра замежных спраў Уладзіміра Макея ўскладаецца вельмі няпростая задача па нармалізацыі адносін нашай краіны з краінамі Захаду, і перш за ўсё — Еўрапейскім саюзам. Сэнс гэтай задачы вызначаецца не міфічным жаданнем «працягнуць лімітрофную (памежную) гульню на супярэчнасцях паміж Захадам і Усходам», а надзённай неабходнасцю нармалізаваць беларуска-еўрапейскія адносіны, што патрабуецца ў кантэксце непазбежнага збліжэння Еўрапейскага саюза і Еўразійскага саюза («інтэграцыі інтэграцыі»).

У сваю чаргу, знакавыя крокі прадпрымае і расійскі бок. Мяркуючы па стасунках з вядучымі расійскімі экспертамі, якія займаюцца постсавецкай прасторай і інтэграцыйнымі працэсамі, «пуцінскі» пул экспертаў усё ў большай ступені пераарыентуецца з канфрантацыйнага на канструктыўны лад пры ўзаемадзеянні з Беларуссю. Замест пошуку варыянтаў супрацоўніцтва з апазіцыйнымі сіламі гэтыя структуры пераарыентуюцца на ўзаемадзеянне з уладай і праўладнымі арганізацыямі. Паказальнай і знакавай у гэтым плане стала сустрэча кіраўніка расійскага Інстытута краін СНД Канстанціна Затуліна з беларускім лідарам Аляксандрам Лукашэнкам. У свой час Інстытут краін СНД адыграў немалую ролю ў арганізацыі агульнай крытыкі беларускага кіраўніцтва ў расійскіх СМІ. Як паказала згаданая сустрэча, сёння сітуацыя ў корані змянілася.

Тым не менш, упадаць у эйфарыю ад таго, што адбываецца, і думаць, што асноўныя тэндэнцыі развіцця стратэгічнай сітуацыі канчаткова вызначаны, было б заўчасным. Два ключавыя фактары рызыкі ў гэтай сітуацыі застаюцца нязменнымі і патэнцыйна вельмі небяспечнымі.

Першы фактар — нізкі ўзровень якасці кіраўніцкіх рашэнняў, якія прымаюцца ў Расійскай Федэрацыі, а таксама ва ўзаемадзеянні з расійскімі калегамі на ўзроўні Адзінай эканамічнай прасторы. Асабліва гэта тычыцца арганізацыі развіцця прамысловасці, перш за ўсё цяжкай, прамысловасці і машынабудавання. На жаль, у цяперашні час няма ніякіх прыкмет таго, што хоць бы ў адной з ключавых для тэхналагічнага развіцця сфер — станкабудаванні, самалётабудаванні, суднабудаванні, іншых галінах — сітуацыя ў Расіі прынцыпова змяняецца да лепшага. Больш за тое, ва ўмовах пачатку другой хвалі глабальнага крызісу (якая, вядома, не дасягне поўнай сілы, пакуль не скончацца прэзідэнцкія выбары ў ЗША) гэтая няздольнасць перайсці да рашучага развіцця хутка стане ўсеагульна відавочнай праз верагодную адстаўку ўрада Д. Мядзведзева.

Знаходзячыся ў фарватары такой слабай прамыслова-тэхналагічнай і сацыяльнай палітыкі Расійскай Федэрацыі, Беларусь і Казахстан, як, зрэшты, і сама Расія, ставяць сябе ў вельмі складанае і патэнцыйна небяспечнае становішча. Справа не толькі ў тым, што няздольнасць вырашыць вострыя праблемы ва ўмовах разбуральнай другой хвалі глабальнага крызісу прывядзе да грамадска-палітычнай дэстабілізацыі нашых краін.

Справа таксама ў тым, што ва ўмовах адсутнасці эфектыўнай прамысловай, эканамічнай і сацыяльнай палітыкі ініцыятыва на Адзінай эканамічнай прасторы ўсё больш пераходзіць да прыватных фінансавых, палітычных і сілавых груп. А іх інтарэсы часта супярэчаць інтарэсам еўразійскай інтэграцыі і інтарэсам забеспячэння бяспекі рэгіёна. І гэта другі прынцыповы фактар рызыкі ў цяперашняй сітуацыі. Калі ў Адзінай эканамічнай прасторы і Еўразійскага саюза не будзе магутнай прамысловай і эканамічнай стратэгіі, плёнам інтэграцыі трох краін скарыстаюцца прыватныя (а часам — і залежныя ад замежных суб'ектаў) сыравінныя і фінансавыя структуры, што ў рэшце рэшт прывядзе і да разбурэння Еўразійскага саюза, і да дэстабілізацыі рэгіёна ў цэлым.

Тое, што названыя рызыкі беларускім кіраўніцтвам ўсведамляюцца, відаць па заявах Аляксандра Лукашэнкі, зробленых на сустрэчы з журналістамі 1 верасня. Прэзідэнт прама і адкрыта заявіў аб прыярытэце ўнутранага інвеставання перад прыцягненнем замежных інвестыцый. Гэты імператыў апоры на ўласныя сілы ў арганізацыі эканамічнага развіцця можа стаць тым выратавальным зачынам, які дазволіць на практыцы рэалізаваць еўразійскую інтэграцыю ў інтарэсах народаў нашага рэгіёна.

**Юрый ЦАРЫК, палітычны аналітык, кіраўнік Грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы.**
**tsarik.inform @ gmail.com**

17 сентября 2012 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».
Повестка дня:
1. О совершении сделок общества.
Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой» – г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Время регистрации – в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 10.09.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
УНП 200050191 Совет директоров.

■ З газетай — па жыцці

# Я ЎЖО ГЕРОЙ СЛАВЫ ТРОХ СТУПЕНЯЎ «ЗВЯЗДЫ»!

**Так пажартаваў шматгадовы верны падпісчык газеты, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Мазуркевіч. І не беспадстаўна!**



Аляксандр Аляксандравіч — даволі ўдачлівы падпісчык: тройчы яму шанцавала ў звяздоўскай латарэі. 10 гадоў таму выйграў тэлевізар (і дагэтуль добра працуе), потым — шпалеры (10 трубак), а па выніках апошняй звяздоўскай латарэі — чайнік.

Ён выпісвае «Звязду» некалькі дзесяцігоддзяў — таму што любіць беларускую мову.

— Заўсёды ўдзельнічаю ў латарэі, — прызнаецца ветэран. — Захоўваю вернасць любімай газеце, раблю выразкі цікавых матэрыялаў па самых розных тэмах.

Мы калісьці ўжо пісалі пра цікавы лёс Аляксандра Мазуркевіча. Сваё 18-годдзе ён адзначаў 10 мая 1945 года ў Берліне. А да гэтага, у 1943-м, юнак (ды што юнак — па сутнасці, падлетак!) быў прыняты ў склад дыверсійна-разведвальнай групы партызанскай брыгады імя Чкалава. Даводзілася займацца ў тым ліку і агітацыйнай работай сярод мясцовага насельніцтва.

Паколькі Саша Мазуркевіч добра ведаў родную мову, у яго абавязкі ўваходзіла чытанне лістовак, зводак Саўінфармбюро, падпольных газет, сатырычных лісткоў, іншых партызанскіх друкаваных выданняў, якія ў асноўным выпускаліся на беларускай мове.

*— Я быў партызанам асобнага атрада Івянецкай зоны Баранавіцкага партызанскага злучэння. Раніцай 3 ліпеня атрымалі загад рухацца да Мінска, да якога было амаль 25 км. Ужо добра было чуваць грукат гармат. У небе праляталі нашы знішчальнікі. У сярэдзіне дня пад'ехалі да вёскі Пціч. Нам паведамілі, што ў суседняй вёсцы Новы Двор ужо, мабыць, нашы войскі. Рушылі туды. На падыходзе да вёскі з хмызняку насустрач нам выходзяць чырвонаармейцы. Спачатку спыталі, хто мы, праверылі дакументы: партызанаў яны бачылі ўпершыню. А што пачалося потым, нават цяжка расказаць! Моцныя поціскі рук, гарачыя абдымкі, пацалункі, падкідванне ўгору... Гаворцы не было канца. Нас шчыра частавалі трафейнымі ласункамі, а пасля запрасілі на салдацкую вячэру. Але яна, на жаль, не адбылася. Пачалася моцная страляніна, на вёску рухалася нямецкая калона: вораг не ведаў, што гэты населены пункт ужо вызвалены Чырвонай Арміяй (думалі, што тут толькі партызаны). Мы вымушаны былі адкласці ўбок кацялкі з такой смачнай салдацкай кашай і ўзяцца за зброю. Разам з вайскоўцамі адбівалі варожы націск... Калі страляніна амаль спынілася, наступіла трывожная ноч. На досвітку, 4 ліпеня, як толькі мы крыху ад'ехалі ад вёскі, адразу трапілі пад варожы агонь. Гэта былі немцы, якіх мы вечарам разагналі ў час бою. Дзейнічалі сумесна: чырвонаармейцы і партызаны. Мяне і яшчэ чатырох хлопцаў (з іх памятаю Пятра Лукашэвіча і Юзіка Мяцельскага) з двума ручнымі кулямётамі камандзір накіраваў нанесці ўдар па ворагу з тылу... Сярод немцаў пачалася паніка, яны сталі разбягацца, кідаючы зброю і параненых. І вось тут вельмі спатрэбіліся нашы коні. Мы даганялі ворага і бралі ў палон. У гэтым баі было знішчана і ўзята ў палон каля 100 захопнікаў, сярод іх некалькі здраднікаў са Смаленскай службы бяспекі, якія ў апошні час люта зверствавалі ў Мінску.*

Але тады, у ліпені 1944-га, Мазуркевіча ў армію не ўзялі: з-за ўзросту. Некалькі месяцаў працаваў на чыгунцы. «А як толькі пачалі прызываць мой год, адразу пайшоў добраахвотнікам на фронт. Ад броні, якую меў, адмовіўся».

У складзе войскаў 1-га Беларускага фронта Аляксандр Мазуркевіч дайшоў да Берліна.

...Адзін з самых любімых фотаздымкаў Аляксандра Аляксандравіча — яго маленькія ўнукі ўдваіх «апранаюць» дзядулеў пінжак з узнагародамі.



Унукі.



1945 год.

— Ну, цяпер ужо яны разам у мой пінжак не ўлезуць! — усміхаецца ветэран. — Лёша скончыў гістфак і магістратуру педуніверсітэта імя Максіма Танка, рыхтуецца да паступлення ў аспірантуру. Людачка таксама скончыла гэтую ВНУ.

Сам Мазуркевіч адразу пасля дэмабілізацыі ў 1951-м (у 25 гадоў!) пайшоў вучыцца: у 7 клас вячэрняй школы. Пасля вячэрне скончыў тэхнікум і завочна — інстытут.

Ён стаў будаўніком, таму што за вайну надта шмат бачыў разбурэнняў-руйнаванняў. Паўвека працоўнага стажу!

**Таццяна ПАДАЛЯК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з сямейнага альбома**

■ З наваселлем!

## Новы інтэрнат для студэнтаў

АДНЫМ ДАЎГАБУДАМ У БРЭСЦЕ ПАМЕНШАЛА

**Студэнты Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна пачалі засяляцца ў новы інтэрнат па вуліцы Пушкінскай. Гэтага наваселля студэнцкі люд чакаў амаль тры выпускі — цэлых 14 гадоў.**

Узвядзенне аб'екта пачалося ў далёкім ужо 1998 годзе. А потым розныя фінансавыя праблемы адсоўвалі ажыццяўленне праекта далей і далей. І невядома яшчэ, колькі часу збіралі б грошы, каб на даўгабуд не звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы падчас адной з рабочых паездак у Брэст тры гады таму. 30 мільярдаў рублёў было выдаткавана, і будаўнікі ўзяліся за работу. Да пачатку гэтага навучальнага года інтэрнат увялі ў строй. А гэта значыць, што 352 студэнты БрДУ атрымаюць месцы для пражывання, а не будуць абцяжарваць бацькоўскі кашалёк аплатай здымнай кватэры. Дзевяціпавярховы дом для студэнтаў радуе святлом і ўтульнасцю. Пакоі на два і тры чалавекі аб'яднаны ў блокі. У блоку на 11 месцаў ёсць два душавыя і туалетныя пакоі. Абсталяваны чытальныя залы, бытавыя памяшканні. Адным словам, ёсць усё, што паспрыяе арганізацыі побыту юнакоў і дзяўчат на карысць добрай вучобе. Як сказаў падчас урачыстага адкрыцця інтэрната рэктар ВНУ Мечыслаў Часноўскі, з уводам у строй аб'екта сціплыя 40% забяспечанасці жыллём студэнтаў адразу змяніліся лічбай 70%. А праз нейкі месяц чакаецца адкрыццё пасля працяглага рамонту інтэрната па вуліцы Леніна. Там таксама пасяляцца больш за 300 чалавек. Гэта будзе азначаць, што практычна ўсе прыезджыя студэнты ўніверсітэта атрымаюць месцы ў інтэрнатах.

**Яна СВЕТАВА**

■ Здарэнне

## Падлетак загінуў на мосце

**У выніку няшчаснага выпадку ў Чэрыкаве загінуў падлетак 1997 года нараджэння.**

— Каля 19 гадзін вечара хлопчык разам са сваімі аднагодкамі гуляў на мосце праз Сож, размешчаным на аўтамабільнай дарозе Чэрыкаў — Краснаполле ў раёне вуліцы Басіна. Знаходзячыся на лесвіцы абслугоўвання моста на адзнацы 20 метраў, у нейкі момант ён аступіўся і ўпаў на аснову апоры, — сказалі ў цэнтры прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Загінулага дасталі і даставілі на бераг работнікі МНС. Праверку па факце няшчаснага выпадку зараз праводзіць пракуратура Чэрыкаўскага раёна.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ А не шкодзь!

## У браканьераў пайшла «пуціна»

**Работнікі Любанскай міжрайінспекцыі затрымалі аўтамабіль, якім кіраваў 31-гадовы індывідуальны прадпрымальнік. У багажніку транспартнага сродку «знайшліся» тры палімерныя мяхі з карпам, два рыбацкія касцюмы і тры стаўныя сеткі агульнай даўжынёй 150 метраў.**

— Падчас разбору было ўстаноўлена, што гэты мужчына разам з яшчэ двума грамадзянамі пранік на тэрыторыю сажалкі рыбакомплексу. Пры дапамозе сетак яны скралі 127 кілаграмаў рыбы на суму амаль 4 мільёны рублёў. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

У той дзень зламыснікі нібы дамовіліся: гэта быў не адзінкавы факт, калі яны спакушаліся, як здавалася ім, лёгкай здабычай. Работнікі Тураўскай міжрайінспекцыі за крадзеж рыбы на адной з сажалак рыбгаса «Белае» затрымалі непрацуючага грамадзяніна. Той паспеў «абзавесціся» 90 кілаграмамі сажалкавага карпа на суму звыш 3 мільёнаў рублёў. А на вадасховішчы «Пагост» паблізу адной з вёсак Пінскага раёна работнікі Пінскай міжрайінспекцыі затрымалі двух грамадзян, якія лавілі рыбу сеткамі пры дапамозе гумавай лодкі. Вага незаконнага ўлову склала 34 кілаграмы і па шкодзе прыроднаму асяроддзю была ацэненая на суму звыш 7 мільёнаў рублёў. Браканьераў чакае крымінальная адказнасць.

## За адзін дзень застрэлілі двух ласёў

**Непадалёку ад прамысловай зоны нафтаправода «Дружба» работнікі Полацкай міжрайінспекцыі знайшлі 90-кілаграмовую тушу ласясяголетка з агнястрэльнымі ранамі. Шкода навакольнаму асяроддзю ацэненая ў 9,5 мільёна рублёў. Праваахоўныя органы вырашаюць пытанне крымінальнай адказнасці.**

— У гэты ж дзень работнікам Вілейскай міжрайінспекцыі паведамілі, што на беразе Вілейскага вадасховішча, паблізу адной з вёсак, з'явіўся паранены лось. Звер упаў у некалькіх метрах ад вады і сканаў, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. — На месцы дзяржінспектары, супрацоўнікі міліцыі і прадстаўнікі арандатара паляўнічых угоддзяў устанавілі, што лось загінуў ад агнястрэльнага ранення: з 350-кілаграмовай тушы жывёлы дасталі кулю 12-га калібру і карцеч. Мяса перадалі арандатару паляўнічых угоддзяў. Шкода прыродзе склала 9,5 мільёна рублёў. Праваахоўныя органы па гэтым факце праводзяць праверку.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# ВЕРАСЕНЬ — МЕСЯЦ ГАРАЧЫ

ЛІЧАЦЬ ТЫЯ, ХТО АХОЎВАЕ ПРЫРОДУ З НЯБЁСАЎ









**ПАЛЁТ лесапатрульнага экіпажа Полацкага авіяаддзялення ўжо завяршаўся, і шлях стомленага за тры гадзіны працы ў небе верталёта Мі-2 ляжаў на базу, як раптам у далечыні злева па курсе стаў вымалёўвацца сілуэт белага воблака над бяскрайнім даляглядам лясоў. Па ўсіх прыкметах гэта быў дым ад ляснога пажару. Лётчык-назіральнік Уладзімір Пірог (на фота злева) пацягнуўся да прыборнай дошкі і ўстанавіў неабходны курс на дым. Некалькі гадзін таму, калі палёт толькі пачынаўся, ніякіх падстаў для больш пільнага ўзірання ў абрысы гэтага азёрна-ляснога куточка Полаччыны яшчэ не было. Шлях да аб'екта трывогі быў няблізкі — каля дваццаці пяці кіламетраў, а гэта добрых 15 хвілін лёту. Пілот не памыліўся — гарэў стары хвойны лес між азёраў у раёне Дрэтуні. І авіяборт спяшаўся да высокага бела-шызага дымнага слупа, каб назіральнік мог своечасова вызначыць дакладнае месца ўзгарання, ацаніць плошчу, ахопленую агнём і інтэнсіўнасць пажару, зрабіць здымкі і перадаць інфармацыю работнікам лясной аховы і службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Ні ў якім разе нельга было дапусціць распаўсюджванне агню на большую тэрыторыю, бо магла здарыцца сапраўдная экалагічная катастрофа.**

Колькі магчымых катастроф папярэджваюць спецыялісты паветранай аховы лясоў за адзін гарачы летні ці сухі асенні дзень, за некалькі тыдняў спёкі, за ўвесь пажаранебяспечны сезон?! І як бы пачувала сябе наша матухна-прырода без гэтых штодзённых паветраных палётаў-патрулёў? Нават з надыходам восені прырода Беларусі застаецца ў небяспецы. Верасень сёлета чакаецца цёплым, а ў гэткіх абставінах, як паказвае ранейшы вопыт, лясныя пажары могуць нанесці ўрон нашай экалогіі не малы. Паветраная ахова «Беллесавія» і ў гэтую, здавалася б, прахалодную пару, застаецца ў ранейшай гатоўнасці і вядзе сваё пільнае назіранне з нябёсаў.

— Найбольшую трывогу вераснёвымі днямі выклікаюць паўднёвыя рэгіёны краіны, бо гарымасць у некаторых месцах дасягнула нават 4-га класа, — кажа старшы інспектар лётна-інструктарскага аддзела «Беллесавія» Анатоль Кротаў. — У верасні штогод назіраецца інтэнсіўнае наведванне лясоў грыбнікамі. А яшчэ зонай асаблівай увагі паветранай аховы становяцца балоты і тарфянікі, бо іх наведваюць зборшчыкі журавін. У гэткія дні ў нашых лётчыкаў і пажарных дэсантнікаў выхадных дзён практычна няма. Верасень — месяц для нас цяжкі.

Анатоль Кротаў паведаміў, што з 49 вылетаў бартоў «Беллесавія» толькі за жнівень — а гэты месяц быў сёлета даволі дажджлівы — лётчыкі-назіральнікі выявілі 40 лясных пажараў, 7 узгаранняў у Нацыянальных парках і Палескім радыяцыйным запаведніку, 23 — на палях, тарфяніках і балотах краіны. Сіламі сваіх пажарных дэсантнікаў ліквідавана 15 узгаранняў.

Але вернемся да палёту Мі-2, якім кіруе пілот-інструктар Канстанцін Грышчанка (на фота справа). Верталёт ужо літаральна завісае над ачагом небяспекі. На борце знаходзяцца парашутна-пажарныя дэсантнікі: Андрэй Круменш і старшы інструктар Ігар Бальцэвіч (на фота ўнізе), якія чакаюць пасадкі верталёта і гатовыя паспяшацца на ліквідацыю пажара. Лётчык-назіральнік Уладзімір Пірог вызначае каардынаты і з дапамогаю камп'ютара перадае інфармацыю наземным службам. Літаральна ў лічаныя хвіліны дрэтуньскія леснікі выязджаюць у раён возера Чарвятка на ўтаймаванне вогненнай стыхіі.

У зону назірання полацкага авіяаддзялення ўваходзяць асабліва ахоўныя тэрыторыі, такія як заказнікі «Балота Ельня» і «Асвейскі», нацыянальны парк «Браслаўскія азёры», балоты «Мох», « і «Лебядзіны мох». А ўся тэрыторыя, якая ахоўваецца, складае 807,9 тысячы гектар, яе можна агледзець, адмераўшы ў паветры чатырыста з гакам кіламетраў. Шэсць лясных пажараў і ўзгаранняў, зафіксаваных у апошні час полацкім авіяцыйным лесапатрулём, не нанеслі прыродзе вялікай шкоды. І ў гэтым, безумоўна, заключаецца галоўны сэнс працы экіпажаў паветраных суднаў, на бортах якіх напісана «Беллесавія».

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**
*Полацкі раён.*

■ Шпацыр па Камароўцы

# РУПЛІВЫМ ГАСПАДЫНЯМ ЗАРАЗ СЮДЫ — «САМЫ СОК»!

**...А яшчэ — кампот, варэнне, марынаваныя і сушаныя грыбы, таксама розныя леча і салаты...Сезон рабіць нарыхтоўкі на зіму — якраз у разгары. Камароўскія латкі прапануюць усё неабходнае для гэтага шчасця і прымушаюць руплівых гаспадынь здзяйсняць «рэйды» на прадмет «што пачым». Карэспандэнт «Звязды» ў чарговы раз наведалася на рынак і паглядзела, як змяніліся кошты, што прапануюць, пра што гавораць і на што робяць зніжкі.**

...Заходжу за вароты рынку і чамусьці пачынаю адчуваць сябе няёмка. Разуменне, чаму ж так адбываецца, прыходзіць не адразу, але яскрава і даходліва: побач спыняецца жанчына, і спыняецца не проста так, а каб перадыхнуць ад трох сумак, якія мужна цягне ў руках. Ага, тут ніхто з пустымі рукамі не ходзіць. Бяруць шмат і ўсяго адразу.

— А мех салодкіх перцаў колькі будзе каштаваць?

— Гэтыя па 6,5 тысячы рублёў за кілаграм. Будзеце мех браць — узважым.

Кошт на перцы на Камароўцы трымаецца ў межах 6—13 тысяч, на памідоры — у сярэднім 5-14 тысяч. І калі перцы ў ліпені каштавалі 32 тысячы, то цяпер самае дарагое, што ўдалося пабачыць — 16 тысяч за кілаграм (ярка-чырвоныя і на дзіва аднолькавыя), а памідоры можна знайсці і па 4 тысячы за кілаграм, але гэта самыя маленькія, памерам са сліву.

Капусту ў самым пачатку рынку прадаюць амаль па 6 тысяч за кілаграм, але дастаткова прайсці крыху далей, туды, дзе гаспадары агародаў і дач прапануюць уласную гародніну, можна знайсці варыянт на тысячу-дзве таннейшы. Капусту, напрыклад, можна купіць па 3-4 тысячы, буракі — па 2,5-3 тысячы, кілаграм морквы абыдзецца ў 4-5 тысяч рублёў. Кошт цыбулі залежыць ад гатунку. Хочаце купіць звычайную — па 6,5 тысячы за кіло, а калі пажадаеце чырвоную для салатаў — прыйдзецца аддаць ужо 9 тысяч. Бульбу на Камароўцы прапануюць у асноўным па 3 тысячы за кілаграм. Дзе-нідзе кошт меншы — 2,3-2,5. І гэта зусім не дробныя клубні. Захочацца да стравы смачнага зяленіва — будзьце гатовыя выдаткаваць 5-10 тысяч рублёў. Пучкі кропу, пятрушкі, кінзы і базіліку каштуюць у межах гэтай сумы.

Яшчэ на рынку зараз шмат грыбоў. За трохлітровае вядзерца баравікоў большасць камароўскіх прадаўцоў просіць 110-120 тысяч рублёў. Маленькія баравічкі, якія можна марынаваць, не рэжучы, яшчэ даражэйшыя: адна літровая пасудзіна — 80 тысяч. Тры літры такіх — 240 тысяч! Падасінавікі і абабкі не так «кусаюцца» — усяго толькі 30 тысяч за трохлітровае вядро. Калі нехта любіць апенькі — рыхтуйце 25 тысяч за вядро. Шампіньёны і вешанкі — 26-28 тысяч. Лісічкі цяпер падаражэлі. Калі параўноўваць з пачаткам сезона ў чэрвені (15 тысяч), цяпер прыйдзецца аддаць на 5 тысяч больш.

— Чаму такія дарагія грыбы, пытаецеся? А вы ўмееце пад яловымі лапкамі поўзаць? — агаропшыў адказам на маё здзіўленне адносна кошту грыбоў прадавец Алег, які ўласнаручна прывёз на рынак тры вядзерцы баравікоў з-пад Смалявіч.

Больш пытанняў не задаю, бо поўзаць пад яловымі лапкамі сапраўды не спрабавала, і тут жа прыходзіць думка, што прадаўцы з Камароўкі не такія ўжо і бязлітасныя. Узгадваю, як на мінулых выхадных цікавілася коштам на баравікі на імправізаваным рынку ля дарогі недалёка ад Лагойска. За тыя ж тры літры грыбоў там прасілі 130 тысяч.

Ягадны камароўскі асартымент крыху здзівіў. Па-першае, розніца ў коштах на журавіны ў двух розных месцах — 10 тысяч. 35 і 25 тысяч менавіта за кілаграм (латкоў з журавінамі, дзе прадавалі на вагу, было толькі два, у іншых месцах былі вёдры, слоікі і кубкі, таму колькі ж каштуе кілаграм там, вызначыць было праблематычна). Па-другое, цяпер з'явіліся «восеньскія» ягады, якія многія бяруць на лекі — каліна і абляпіха (15 і 20 тысяч за паўлітра). І нарэшце — некаторыя да гэтага часу знаходзяць у лесе чарніцы, хоць сезон іх — да жніўня, самае позняе. Захочацца наляпіць варэнікаў — «адшкадуйце» 25 тысяч рублёў за паўлітра...

**За трохлітровае вядзерца баравікоў большасць камароўскіх прадаўцоў просіць 110-120 тысяч рублёў. Маленькія баравічкі, якія можна марынаваць, не рэжучы, яшчэ даражэйшыя: адна літровая пасудзіна — 80 тысяч. Тры літры такіх — 240 тысяч!**

— Падыходзьце, выберам вам кавун! — з усіх бакоў крычаць прадаўцы, як толькі даходжу да шэрагаў з садавінай.

З летніх 5 тысяч за кілаграм кошт на «паласацікаў» знізіўся да 3-3,5 тысяч. Дыня таксама стала больш даступным ласункам. Па 7 тысяч за кілаграм каштуюць узбекскія, а астраханскія і таго менш — 5. У канцы лета — пачатку восені на Камароўцы з'явіўся інжыр. Каштуе 4-5 тысяч за кілаграм.

Цікаўлюся коштам на беларускія яблыкі: у сярэднім — 5-10 тысяч. Бабулі з уласнага саду аддаюць па 3 тысячы.

— Вядзерца за 6 тысяч саступлю, варэнне цудоўнае зробіце, — спакушае мяне гаспадыня гэтага самага вядзерца з белым налівам. Адмаўляюся, бо варэння ў сваім жыцці ніколі не варыла, і з такой колькасцю яблык нават не ведаю, што і рабіць. Таму адзінае, што застаецца — разам з пакупкамі пытацца ў прадаўцоў і сакрэты смачнага прыгатавання ўсяго набытага.

Напрыклад, наконт каліны мне далі такую параду. Ягады памыць і ашпарыць кіпнем, пасля працерці праз марлю і дадаць цукар у прапорцыях 1 да 1. Пачысціць і парэзаць некалькі апельсінаў і патушыць іх паўгадзіны ў цукровым сіропе, пасля чаго дадаць працёртую каліну і закласці ў слоікі.

Угледзеўшы маленькія, падобныя па форме да лімонаў аранжавыя плады, я перш за ўсё запыталася не рэцэпт, а «што гэта такое?». Аказалася — «мядовы гарбуз», з якога атрымліваецца цудоўная запяканка. Гарбузы чысцяць, рэжуць на маленькія кавалкі, а пасля тушаць іх хвілін дваццаць. У масу з тварагу, яек, цукру і маннай крупы варта дадаць тушаную «мядовую» смакату, паставіць у духоўку на 40 хвілін, а пасля можна ласавацца восеньскім дэсертам.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Факт

## У Беларусі зніжаецца ўзровень пранікнення сотавай сувязі

**Сотавы аператар velcom занепакоены зніжэннем узроўню пранікнення сотавай сувязі ў Беларусі. Аб гэтым паведаміў журналістам галоўны выканаўчы дырэктар ЗП «Вэлком» Гельмут Дуз, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.**

Узровень пранікнення сотавай сувязі ўпершыню знізіўся ў Беларусі ў першым паўгоддзі гэтага года. Прычым калі ў аператараў velcom і МТС колькасць абанентаў у другім квартале вырасла, то ў аператара life:) знізілася на 500 тыс.

«Але гэта тэндэнцыя прымушае задумацца не толькі асобнага аператара, а галіну ў цэлым», — адзначыў Гельмут Дуз. На яго думку, узровень пранікнення сотавай сувязі ў Беларусі зніжаецца, паколькі абаненты адмаўляюцца ад лішніх сім-картак. Па меры таго, як скарачаецца розніца паміж цэнамі на званкі ўнутры сеткі і ў іншыя сеткі, абаненты ўсё больш аддаюць перавагу аднаму аператару.

Гельмут Дуз таксама расказаў, што кампанія застаецца буйнейшым у Беларусі прадаўцом мабільных тэлефонаў. Сёння яна рэалізуе 40 працэнтаў афіцыйна прадаваемых у Беларусі тэлефонаў.

Аператар velcom быў створаны ў ліпені 1998 года як сумеснае беларуска-кіпрскае ТАА «Мабільная лічбавая сувязь». 22 жніўня 2007 года аператар змяніў юрыдычную назву на «Замежнае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Мабільная лічбавая сувязь» пасля набыцця кіпрскай SB Telecom Ltd. дзярждолі ў аператары. У кастрычніку таго ж года Telekom Austria Group аб'явіла аб дасягненні пагаднення аб куплі 70 працэнтаў кіпрскай SB Telecom Ltd. прыкладна за 730 млн еўра. Пакупніком выступіла падраздзяленне Telekom Austria па мабільнай сувязі Mobilkom Austria. 15 мая 2008 года аператар змяніў назву на ЗП «Вэлком». У кастрычніку 2010 года Telekom Austria Group выкупіла астатнія 30 працэнтаў беларускага сотавага аператара.

**БЕЛТА.**

## Паборы ў школах абяцаюць спыніць

**Сталічныя ўлады намераны жорстка караць за факты пабораў у мінскіх агульнаадукацыйных установах.**

— Калі ўстановім, што бацькоў прымушаюць збіраць сродкі, што настаўнікі і адміністрацыя школы адыгрываюцца на дзецях, чые бацькі адмовіліся грошы здаваць, то будзем прымаць самыя жорсткія захады да такіх кіраўнікоў і педагогаў, — папярэдзіў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар Карпенка.

Па словах Ігара Карпенкі, сёння ў школах дзейнічаюць бацькоўскія камітэты і папячыцельскія рады, адкрыты спецыяльныя рахункі для збору ахвяраванняў, у тым ліку і ад бацькоў.

— Бацькі сумесна са школай павінны вызначаць, што яны жадаюць зрабіць і для чаго. Напрыклад, могуць прапанаваць закупіць нейкія дадатковыя сродкі навучання. Справа патрэбная. Але ўсё павінна знаходзяцца ў рамках разумнага і рабіцца добраахвотна. Ніякай «абавязалаўкі» быць не павінна,— падкрэсліў намеснік старшыні Мінгарвыканкама.

«Мінгарвыканкам адкрыты для зваротаў грамадзян, — дадаў Ігар Карпенка. — Я вяду асабісты прыём двойчы на месяц — па серадах і суботах. Графік прыёму можна паглядзець на сайце Мінгарвыканкама. — Дні прыёму ёсць і ў Камітэце па адукацыі. Разбіраемся ў кожным канкрэтным выпадку і, калі патрэбна, выязджаем на месца».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Дзень адчыненых дзвярэй

# УНІВЕРСАЛЬНЫЯ КАДРЫ

## СУЧАСНЫЯ ЖУРНАЛІСТЫ ПАВІННЫ ЎМЕЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ЯК У ТРАДЫЦЫЙНЫХ, ТАК І Ў ІНТЭРНЭТ-СМІ

**Давайце паспрабуем зазірнуць у будучыню... Напэўна, куды прасцей будзе ўявіць яе, калі крыху больш даведацца пра тых спецыялістаў, якіх рыхтуюць сёння вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. Як змяняюцца вучэбныя праграмы, якімі новымі навыкамі і ведамі павінны сёння авалодваць будучыя кадры? Чым выпускнікі новага пакалення адрозніваюцца ад больш сталых калег? Напачатку новага навучальнага года мы вырашылі дазнацца пра некаторыя сакрэты падрыхтоўкі кадраў для інфармацыйнай галіны, запрасіўшы на гутарку дырэктара Інстытута журналістыкі, кандыдата філалагічных навук Сяргея ДУБОВІКА.**



***— На што сёння павінны звярнуць увагу вашы студэнты, каб пасля паспяхова праявіць сябе ў абранай прафесіі?***

— Сёння журналістыка перажывае няпросты перыяд. Пераасэнсоўваецца нават вобраз мыслення ў журналістыцы, які быў, скажам, яшчэ 10 гадоў таму. Значна паскорыўся тэмп жыцця, што, натуральна, адбіваецца на нашай прафесіі. Я маю на ўвазе новыя інфармацыйныя тэхналогіі, якія хутка развіваюцца. Журналіст павінен быць гатовы да таго, што рана ці позна друкаванае слова і слова ў інтэрнэт-прасторы ўступяць у пэўнае супрацьборства. Ужо сёння паштовыя скрыні ў значнай меры апусцелі, мала людзей падпісваецца, як гэта было раней на газеты, часопісы. У бліжэйшай будучыні значная колькасць аўдыторыі традыцыйных СМІ пяройдзе у інтэрнэт. Таму ўжо сёння мы робім захады, каб выпускнікі інстытута былі гатовымі да таго, што ім давядзецца працаваць як у традыцыйных СМІ, так і ў новых, у першую чаргу я маю на ўвазе інтэрнэт-СМІ. Ужо тры гады мы рыхтуем студэнтаў па спецыяльнасці вэб-журналістыка — гэта кадры, арыентаваныя для працы на інтэрнэт-сайтах. Акрамя таго, на ўсіх іншых спецыяльнасцях у нас выкладаюцца курсы, дзе студэнты знаёмяцца з самымі сучаснымі метадамі працы ў галіне вэб-журналістыкі. Напрыклад, калі малады чалавек закончыць падрыхтоўку па спецыяльнасці «друкаваныя СМІ», ён можа працаваць як у перыёдыцы, так і ў інтэрнэт-журналістыцы. Мы стараемся рыхтаваць універсальных спецыялістаў. Ніхто не ведае, як складзецца лёс выпускніка. Напрыклад, ён па размеркаванні атрымае першае працоўнае месца карэспандэнтам раённай газеты. У будучыні, калі праявіць пэўныя здольнасці, стане працаваць у абласной газеце. Прычым ён можа быць карэспандэнтам, адказным сакратаром ці адказным за сайт газеты. Адна з задач падрыхтоўкі спецыялістаў сёння — даць такія навыкі, каб яны маглі працаваць у розных сродках масавай інфармацыі і ў рознай якасці. Сёння нельга падыходзіць да падрыхтоўкі журналіста так, як гэта было гадоў 10-20 назад: межы паміж спецыялізацыямі размываюцца. Нярэдка выпускнікі, якія рыхтаваліся для друкаваных сродкаў інфармацыі, становяцца вядучымі тэлевізійных каналаў, спрабуюць сябе ў радыёжурналістыцы. Таму мы павінны даць такую падрыхтоўку нашым студэнтам, каб яны адчувалі сябе як рыба ў вадзе ў любых СМІ.

***— Але журналісту мала проста прыстасавацца да працы ў розных умовах. Што ён павінен умець, каб зачапіць чытача, зацікавіць, заваяваць давер? Напэўна ў новай інфармацыйнай прасторы спатрэбяцца людзі, якія добра разбіраюцца ў «вузкіх» пытаннях?***

— Сапраўды, практыка паказвае, што лепшыя артыкулы — аргументаваныя, прафесійныя — робяць журналісты, якія займаюцца вузкай тэмай. Так, калі журналіст працуе ў эканамічным аддзеле, ён неабавязкова павінен займацца ўсімі эканамічнымі пытаннямі. Напрыклад, ён будзе пісаць пра банкі і пра гэты кірунак ведаць усё. Таму мы распрацавалі і ўвялі ў праграму навучання курсы па эканоміцы, якія ўлічваюць гэту спецыфіку. Стараемся накіроўваць студэнтаў, якія ўжо вызначыліся са спецыялізацыяй, на вытворчую практыку менавіта па тых кірунках, якія яны выбралі. Як правіла, нашы студэнты праходзяць практыку ў верасні, і ў хуткім часе больш за тысячу хлопцаў і дзяўчат прыйдуць практыкавацца ў розных сродках інфармацыі — гарадскіх, раённых, абласных, рэспубліканскіх.

***— Што новага прыўносяць студэнты, якія прыходзяць на практыку ў СМІ?***

— Студэнтаў малодшых курсаў мы стараемся накіроўваць на практыку ў раённыя газеты той мясцовасці, адкуль яны родам. Не сакрэт, што сёння існуе вялікая праблема з кадрамі ў раённых газетах. Па статыстыцы толькі крыху больш за 50 працэнтаў творчых работнікаў раённай прэсы маюць журналісцкую адукацыю, астатнія — людзі розных прафесій... Студэнты Інстытута журналістыкі ўмеюць ствараць і абслугоўваць сайты, чаго часта не хапае мясцоваму друку. Сёння можна назіраць такую карціну: падчас актыўнай практыкі студэнтаў сайты «раёнак» паляпшаюцца. Дарэчы, нашы студэнты прымалі ўдзел у стварэнні цэлага шэрагу сайтаў для раённых газет.

Палова студэнтаў праходзіць практыку ў рэспубліканскіх СМІ, на новых тэлевізійных каналах, радыёстанцыях. Яны адразу акунаюцца ў сучасныя формы працы з электроннымі сродкамі масавай інфармацыі, і ўжо праз месяц могуць працаваць нараўне са штатнымі журналістамі. Многія кіраўнікі СМІ адзначаюць, што сёння студэнтам, якія практыкуюцца, патрэбна значна менш часу на адаптацыю, чым тым, хто прыходзіў працаваць яшчэ пяць гадоў таму. Раней выпускнікам, якіх мы размяркоўвалі ў рэдакцыі аўдыявізуальных сродкаў, патрэбна было часам і некалькі месяцаў на тое, каб прызвычаіцца да працы.

***— І якім чынам удалося паскорыць гэты працэс?***

— Па ўмовах, у якіх вучацца беларускія студэнты (я маю на ўвазе будынак, вучэбныя класы, абсталяванне, тэлевізійны цэнтр), Інстытут журналістыкі БДУ— сярод лепшых навучальных устаноў постсавецкай прасторы, якія рыхтуюць журналісцкія кадры. Моладзь займаецца на самым сучасным радыё-, і тэлеабсталяванні. Нават дэканы расійскіх журфакаў, калі прыязджалі ў Беларусь, былі ўражаны нашым тэлецэнтрам.

Штогод у чэрвені праводзіцца медыяфорум, на які прыязджаюць лепшыя журналісты СНД. На базе Інстытута яны праводзяць майстар-класы, распавядаюць пра тое новае, што адбываецца ў сферы масмедыя, сустракаюцца з нашымі студэнтамі. Вядома, мы цікавімся ўражаннямі гасцей ад сустрэч з моладдзю, якая вучыцца ў Інстытуце журналістыкі БДУ, і іх адзнакі якасці падрыхтоўкі заўсёды даволі высокія. Нашы выпускнікі запатрабаваны не толькі ў беларускіх, але і расійскіх СМІ. Штогод павялічваецца колькасць замежных студэнтаў, якія хочуць атрымаць журналісцкую адукацыю ў Беларусі.

Сёння мы актыўна займаемся распрацоўкай новых планаў, праграм у сувязі з тым, што з першага верасня 2013 года падрыхтоўка журналістаў пераводзіцца на 4-гадовае навучанне (завочнае — на 5-гадовае). Сёння на дзённым навучанні журналіст рыхтуецца 5 гадоў (на завочным — 6). І мы павінны зрабіць усё, каб, нягледзячы на скарачэнне тэрміну навучання, якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў засталася на высокім узроўні.

***— Як змянілася моладзь, якая сёння прыходзіць вучыцца ў Інстытут журналістыкі?***

— Асаблівасць нашага факультэта ў тым, што да нас паступаюць матываваныя выпускнікі, якія выбіраюць толькі гэтую прафесію і ніякую іншую. Калі на іншых факультэтах ВНУ абітурыенты здаюць толькі балы цэнтралізаванага тэсціравання, то для таго, каб паступіць на журфак, неабходна здаць экзамен, які называецца «творчасць». Прычым вытрымаць яго ў пісьмовай форме (сачыненне) і вуснай (дзе абітурыент пакажа, якія публікацыі паспеў зрабіць да паступлення, дакажа, што з'яўляецца эрудзіраваным, цікавым, таленавітым чалавекам). За апошнія 5 гадоў сярэдні конкурс у Інстытут журналістыкі не апускаецца ніжэй 2-2,5 абітурыента на месца. І гэта людзі, якія загадзя вызначыліся з прафесіяй, якія хочуць зрабіць сабе імя ў журналістыцы.

Многія паспяваюць зарэкамендаваць сябе ўжо з першых гадоў вучобы. І сёння няма праблем з размеркаваннем выпускнікоў. Вядучыя тэлевізійныя каналы, радыёстанцыі і газеты прыглядаюцца да іх і прыцягваюць да сябе. Многія студэнты ўжо з 2-го курса пачынаюць працаваць на чвэрць ці палову стаўкі. Калі паглядзець «Першы канал», «СТБ» і «АНТ», паслухаць FM-станцыі, можна заўважыць, што значная колькасць карэспандэнтаў, якія робяць рэпартажы — студэнты...

***— Амаладжэнне прафесійнай журналістыкі — гэта плюс ці мінус?***

— Плюс у тым, што з моладдзю прыходзіць новае. Маладыя людзі знаходзяцца ў пастаянным пошуку, стараюцца выкарыстоўваць у сваёй працы сучасныя падыходы, сочаць за тым, што адбываецца ў свеце, пераймаюць лепшае.

***— Ці здольна маладая журналістыка ўплываць на грамадскую думку, весці за сабой чытача, слухача, гледача?***

— Тыя выданні і аўдыявізуальныя сродкі будуць паспяховымі, дзе маладыя і сталыя журналісты працуюць поруч. Запал, напорыстасць, смеласць маладых павінны спалучацца з досведам, разважлівасцю, мудрасцю, якім можна павучыцца ў старэйшых калег. Старое добрае настаўніцтва будзе запатрабавана і надалей.

***— Ваш прагноз: як будзе развівацца журналістыка ў інтэлектуальным плане? Ці будзе запатрабавана аналітыка ў інтэрнэт-СМІ?***

— Думаю, што інтэрнэт-журналістыка выйдзе на першы план, напэўна, у бліжэйшыя 5-10 гадоў. Ужо сёння мы назіраем масавы адыход моладзі ў інтэрнэт — менавіта адтуль яна бярэ навіны. Тэхналогія выпуску газет не дазваляе перыядычным выданням канкурыраваць з інтэрнэтам. Так, пэўная інфармацыя пра нейкую падзею, здарэнне ў інтэрнэце з'яўляецца ўжо на працягу некалькіх гадзін, прычым гэта не проста інфармацыя, але і фотаздымак, сюжэт, каментарыі і водгукі на навіну. Але я не падзяляю радыкальных меркаванняў, што з цягам часу газеты і часопісы знікнуць. Некалі прадракалі, што з развіццём тэлебачання знікне тэатр, але гэтага не адбылося. Так і традыцыйныя СМІ зоймуць сваю нішу. Канкурэнцыя з інтэрнэтам будзе спрыяць развіццю перыядычных выданняў, у іх з'явіцца больш аналітыкі. Людзі, якія захочуць пачуць меркаванні і прагнозы кампетэнтных людзей, будуць звяртацца менавіта да друкаваных выданняў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

■ Мая праўда

**Адзін з аўтараў рубрыкі ўдвая старэйшы за другога. Тым не менш, як высветлілася, у абаіх практычна аднолькавыя ўспаміны пра звычайны стацыянарны хатні тэлефон. Зрэшты, што тут незвычайнага? Яшчэ колькі гадоў таму гэты апарат для многіх быў сапраўднай раскошай, недасяжнай, у пэўным сэнсе слоў, мэтай. Шчаслiўцам зайздросцілі. Не, яго ўладальнік не абавязкова павінен быў быць вядомым акадэмікам, славутым акцёрам — у жыллі звычайных гараджан або вяскоўцаў таксама меўся гэты «цуд» сувязі. Проста, як тады было прынята гаварыць, на ўсіх магутнасцяў — ёмістасці тэлефонных станцый — не хапала. Сваёй чаргі даводзілася чакаць гадамі. Адзін з аўтараў памятае, як па просьбе стрыечнага брата тэлефанаваў у радзільню ў райцэнтры з прахадной фабрыкі — каб даведацца пра здароўе парадзіхі і немаўляці. А будучай жонцы бегаў званіць з пасёлка ў сталіцу дадому да цёткі. Успаміны другога аўтара: у вёсцы, дзе жыла бабуля, каб патэлефанаваць родным, даводзілася несці ў памяшканне сельскага клуба ўласны тэлефонны апарат ці пазычаць яго ў суседа і ўключаць у адзіную на ўвесь населены пункт тэлефонную разетку. Што ж, быў час — аднолькавы для многіх... А вось думкі адносна сучаснай мабільнай сувязі ў аўтараў рубрыкі разышліся кардынальна...**

## Бракуе культуры? Глушыць сігнал!



**Напачатку анекдот, які быў актуальным яшчэ зусім нядаўна — калі толькі-толькі з'явіліся першыя мабільныя тэлефоны і гарнітуры для іх. Увявіце: ідзе чалавек па вуліцы і размаўляе па мабільніку, а большасць навакольных думае, што гэта вар'ят нешта сам сабе пад нос мармыча. А цяпер як? Вар'ят размаўляе ўголас, а ўсім бачыцца, што ён па тэлефоне гутарыць... Як відаць, стаўленне да сітуацыі кардынальна змянілася, прычым за параўнальна кароткі прамежак часу. Цяпер чалавек з мабільнікам у руках — самая што ні ёсць будзённая з'ява. Толькі ці бяспечная? Як для самога ўладальніка тэлефона, так і для навакольных?..**

Пра аўтамабілістаў нават казаць асабліва не даводзіцца: ім абсалютна справядліва забаронена размаўляць па мабільных тэлефонах падчас руху без спецыяльнай гарнітуры. Справядліва, бо рукі занятыя, увага адцягваецца, рэакцыя зніжаецца. А аўтамабіль і без таго — сродак павышанай небяспекі. І правільна іх штрафуюць за парушэнне такога патрабавання. Але апошнім часам чамусьці зноў і зноў лаўлю сябе на думцы, што пэўную небяспеку для навакольных пачалі ўяўляць і... пешаходы з мабільнымі ў руках. На тратуары, у метро, на ўваходзе ў будынак... Кожны з нас, несумненна, бачыў такую сітуацыю: наперадзе цябе, як правіла, павольна, выбіваючыся з агульнай плыні, дакладней, тармозячы яе, ідзе такі балбатун... Адна рука — да вуха, у другой сабраны ўсе сумкі. Фізічна ён побач, але рэальна адсутнічае, бо цалкам увесь — у размове. Можа эмацыянальна ўскінуць руку з мабільнікам вышэй (табе да носа), нечакана зусім спыніцца або павярнуць рэзка назад... Абысці такога складана, бо ніколі не здагадаешся, што ён зараз зробіць. А калі ўдала абыдзеш аднаго, тут жа можаш наткнуцца на іншага, такога ж...

Разумею, калі табе патэлефанавалі па справе і трэба коратка адказаць. Але ж у большасці выпадкаў людзі павольна пераказваюць учарашнюю сустрэчу з сябрамі, убачаную кінастужку ці абмяркоўваюць сваіх знаёмых або несправядлівае начальства. Ці тое з дому зрабіць нельга? Што прымушае чалавека, які ў завею ідзе пехатою ад метро дадому, згінацца ці не напалам ад снегу і ветру ў твар, але пры гэтым набіраць нумар на тэлефоне — каб проста пагутарыць ні аб чым? Залежнасць ад таго тэлефона? А як вам маці, што ў дождж з дваімі малымі дзецьмі пераходзіць дарогу па пешаходным пераходзе: размова з сяброўкай цікавіць яе больш, чым уласныя нашчадкі, якіх яна фактычна пакінула сам-насам і не бачыць пад купаламі парасонаў недзе ззаду...

А хто-небудзь спытаў мяне: ці хачу я па паўгадзіны слухаць гучныя чужыя размовы побач па тэлефоне ў грамадскім транспарце?!. Часам не вельмі культурныя і тактоўныя...

Не падумайце, я толькі за тэхнічны прагрэс! Ён істотна аблегчыў жыццё. Памятаю, падчас вучобы на журфаку часцяком мусіў браць міні-інтэрв'ю ў міністэрскіх чыноўнікаў прама з металічнай чырвонай будкі за рагом факультэта. У адной руцэ — не вельмі зручная слухаўка, другой спрабуеш нешта запісваць у нататнік, паклаўшы яго на маленькую металічную палічку. Яшчэ і ад вулічнага шуму трэба адварочвацца, бо ў будцы не ўсё шкленне на месцы... А прыедзеш у рэдакцыю — там адзін стацыянарны тэлефон на дзясятак чалавек. Напісаў матэрыял, патэлефанаваў суразмоўцу і — паехаў да яго візіраваць тую заметку... Зараз жа — толькі кнопку націсні.

Але ж за прагрэсам нельга забывацца пра культуру паводзін. Трэба некага набраць — адыдзі ў бок на хвіліну-другую, не замінай іншым. Але паглядзіш на тую колькасць людзей, якія ігнаруюць гэтае простае правіла — хоць ты за спецкурс галасуй! У сэнсе: набыў тэлефон — здай залік, як ім правільна карыстацца, каб не ствараць праблем навакольным. Прыгадайце: колькі ні нагадваюць на нейкіх афіцыйных мерапрыемствах, маўляў, вялікая просьба адключыць вашы мабільныя, абавязкова знойдзецца нехта, хто праігнаруе гэтыя словы. І пасярод выступлення (ды ў таго ж самага выступоўцы!) у перапоўненай зале — званок... Ужо не маючы надзеі на добрыя словы, у падобных сітуацыях у свеце сігнал папросту пачалі глушыць перад пачаткам нейкай імпрэзы. Можа, і ў нас так рабіць? А яшчэ, можа, у саміх тэлефонных апаратах вытворцам прадугледзець адмысловую функцыю? Умоўна кажучы, калі чалавек больш за хвіліну размаўляе падчас руху, сувязь аўтаматычна перарываецца?!.

Напэўна, многія ўжо і забыліся, што ёсць такая фраза: нетэлефонная размова. Я ў тым сэнсе, што такі зручны мабільны насамрэч адвучвае нас бачыць вочы суразмоўцы, яго эмоцыі. Пазбаўляе нас нечага важнага. Навошта сустракацца з чалавекам, калі можна стэлефанавацца ў любы час? Раней, калі нават стацыянарныя тэлефоны былі далёка не ва ўсіх, многія хадзілі на перагаворныя пункты і да размовы загадзя рыхтаваліся: што і як сказаць, каб перадаць свае пачуцці, клопат, любоў. Зараз часта мы адказваем, як той казаў, на «аўтамаце». Можа, і пра гэта варта пачаць гаварыць, апроч іншага, дзеткам з самага дзіцячага садка?!. Не ва ўрон, зразумела, прагрэсу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «Балбатуны» — ужо частка культуры



**...Гучная мелодыя прымушае азірнуцца большую частку з прысутных у аўдыторыі студэнтаў, але гэта, хутчэй, па інерцыі, чым са злосці. За чатыры з лішнім гады вучобы мы ўжо добра ведаем, хто з аднакурснікаў заўжды забываецца выключаць на занятках тэлефон. Нехта з выкладчыкаў моцна сварыцца, нехта дазваляе выходзіць з аўдыторыі і адказваць на званок толькі ў дзень нараджэння, а некаторыя ўвогуле не бачаць тут праблемы, нават самі часам могуць мабільнікам на лекцыі пакарыстацца, але толькі для таго, каб сказаць, што пазней ператэлефануюць.**

Цяпер нават дзядулям і бабулям, што абыходзіліся без усемагутнай і паўсюднай тэлефоннай сувязі, дораць мабільныя тэлефоны. Тут галоўнае — растлумачыць, калі цiснуць на чырвоную, а калі на зялёную кнопку. А яшчэ — класці тэлефон заўжды ў пэўным месцы, бо дзве «антэнкі» сувязі можна злавіць толькі на квадратным метры паміж капуснымі градамі і клубніцамі ці дома ў куце пад абразамі...

...Што тут скажаш, гэта вам не горад, дзе па мабілках трашчаць бесперапынна што дарослыя, што малыя дзеці. І ніякага табе супакою. Можа, нешта і ёсць прывабнае ў цяпер лічы, міфічным жыцці без усялякага ўмяшальніцтва мабільных тэлефонаў, але гэта варыянт не для занятых справамі людзей, што жывуць у вялікім горадзе. Яго жыхары цяпер нібыта падзяляюцца на два лагеры: па адзін бок — тыя, хто добра памятае час, калі мабільнікаў (а адпаведна — і «балбатуноў») яшчэ не існавала, па другі бок — у большасці сваёй моладзь, у чыёй свядомасці няма адзнакі пра падзел часу на «да» і «пасля» масавага «мабільнага» захопу жыццёвай прасторы.

Каб пагаварыць на вуліцы па мабільным, не існуе спецыяльна адведзеных месцаў. Усе носяць з сабой мабільнікі, таму гучныя размовы ў грамадскіх месцах па тэлефоне, якія прымаюць за непавагу — гэта ўжо частка нашай культуры, хочам мы таго ці не. Кожны з нас да яе спрычыніўся, таму наракаць на сябе ж — зусім не варыянт. Могуць быць важныя тэлефанаванні падчас знаходжання ў перапоўненым аўтобусе, дзе ўсім людзям давядзецца слухаць самыя нечаканыя падрабязнасці, званок можа перашкодзіць правядзенню заняткаў усім прысутным, а той, каму тэлефанавалі, магчыма, якраз яго чакаў больш за ўсё на свеце. Адкуль мы ведаем, а раптам нязручныя для нас месца і час, калі запішчаў чужы тэлефон, найзручнейшыя для яго ўладальніка? Крытыкаваць такіх людзей можа толькі той, хто ніводнага разу не «аскароміў» сваю кішэню наяўнасцю мабільнага. Ніхто не выключае выпадку, што пры пэўных абставінах абураны непавагай чалавек сам можа стаць парушальнікам спакою.

Цяпер пра выпадкі, калі мабільнікі могуць сапсаваць не толькі нервы, але і здароўе. Зразумела, калі гаворка ідзе пра бяспеку, напрыклад, у выпадках з кіроўцамі, якія не набываюць для сваіх тэлефонаў «хэнд-фры» (навушнікі з мікрафонам), з пешаходамі, што пераходзяць вуліцу і могуць не заўважыць машыну праз захапляльную гутарку па мабільным ці з пужлівымі дзяўчатамі на абцасах вечарам у цёмным завулку, якім таксама было б не лішнім прыслухоўвацца зусім не да шчабятання сяброўкі ў слухаўцы, то тут я згодная — абмежаванне магчымасці размаўляць, напэўна, выратавала б не адно жыццё. Але ж мінімальна адэкватная галава сама павінна думаць за сябе, як бы застацца цэлай. А абурэнне грамадскасці і жаданне пазакрываць роцікі надзвычай гаваркім уладальнікам мабілак выклікана зусім не клопатам пра бяспеку «мабільных» балбатуноў. Ці не так?

Давайце тады ўжо абмяжуем прысутнасць у транспарце курыльшчыкаў, бо ад іх пахне цыгарэтамі, і не дазволім з'яўляцца ў грамадскіх месцах асобам, што выліваюць на сябе вядро парфумы штодня. І будзе ўсім шчасце!

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

■ Азбука бяспекі

## СЦЕРАЖЫСЯ ЗВЕРА НА ДАРОЗЕ: ШТО ЖЫВОГА, ШТО ТРАЎМАВАНАГА!

**Дзяржаўтаінспекцыя занепакоеная станам аварыйнасці і траўматызму ўдзельнікаў дарожнага руху па прычыне наезду аўтатранспартных сродкаў на дзікіх жывёл: з пачатку года такіх выпадкаў зарэгістравана ўжо дзясятак. З гэтай нагоды варта нагадаць кіроўцам пра неабходнасць быць асцярожнымі.**

Дарожна-транспартныя здарэнні з удзелам дзікіх жывёл падобныя адно на адно. Жывёла можа выскачыць з лесу, ісці ўздоўж праезнай часткі, а затым раптоўна зрабіць скачок на процілеглы бок дарогі. Звер можа папросту спыніцца пасярод дарогі, і гэта можа азначаць, што з лесу павінны паказацца яго дзіцяняты. Ведаючы пра маршруты міграцыі жывёл, на дарогах устанаўліваюцца папераджальныя дарожныя знакі «Дзікія жывёлы».

Уехаўшы ў зону дзеяння такога знака, трэба найперш сачыць за бяспечнай хуткасцю руху. Убачыўшы паблізу дарогі ці на праезнай частцы жывёліну, неабходна максімальна знізіць хуткасць, аж да спынення, і ўключыць аварыйную светлавую сігналізацыю для прыцягнення ўвагі іншых удзельнікаў дарожнага руху. Трэба памятаць, што звер не ў стане адэкватна ацэньваць хуткасць аўтамабіля, які рухаецца. Не трэба спрабаваць аб'ехаць жывёліну, бо яе паводзіны — непрадказальныя. Не варта рэзка мяняць напрамак руху: найчасцей кіроўцы і пасажыры атрымліваюць смяротныя траўмы не ў выніку сутыкнення, а пасля з'езду з праезнай часткі і наступнага перакульвання ці наезду на прыдарожныя дрэвы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Калі ж звера ўсё ж збілі, дык лепш не падыходзіць да яго: у стане шоку жывёліна здольная знявечыць ці нават забіць таго, хто да яе наблізіцца. Калі звер атрымаў траўму або загінуў, прысвойваць яго таксама нельга.

Дарэчы, пры сутыкненні з дзікай жывёлай кіроўца абавязаны выклікаць работнікаў ДАІ і аформіць дарожна-транспартнае здарэнне. У гэтым выпадку можа быць выплачана страхавая кампенсацыя (калі аўтамабіль застрахаваны па КАСКО). За самавольны з'езд з месца ДТЗ пагражае адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу памерам ад 5 да 25 базавых велічынь або пазбаўленне права кіравання тэрмінам да двух гадоў.

Калі ўсё ж кіроўца забярэ збітую ім дзікую жывёліну з сабой, дык такса па пакрыцці шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, складзе (па відах): за лася і высакароднага аленя — па 95 базавых велічынь, за іншыя віды атраду — па 60 базавых велічынь.

Такім чынам, пры самым горшым раскладзе, кіроўцу, які збіў дзікую жывёлу, чакае: разбіты аўтамабіль, пацярпелыя ў ім людзі, штраф за дарожна-транспартнае здарэнне, даволі вялікая кампенсацыя, якую трэба будзе выплаціць за збітую жывёлу. І для паўнаты малюнка — адсутнасць выплаты страхавога пакрыцця, калі аўтамабіль не быў застрахаваны па КАСКО. Так што лепш — і бяспечна, і танней для кішэні — прытрымлівацца правілаў дарожнага руху і здаровага сэнсу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Здарэнні

### Жанчына і лось загінулі

**На дарозе ў Светлагорскім раёне пад колы «Рэно-10», якім кіраваў 64-гадовы мужчына, раптам кінуўся лось.**

Пасля сутыкнення іншамарка з'ехала на абочыну і стукнулася аб дрэва. Траўмы атрымалі двое пасажыраў 1953 года нараджэння. Пацярпелыя шпіталізаваны ў Светлагорскую цэнтральную раённую бальніцу. Маладая жанчына, якая таксама знаходзілася ў салоне, памерла ад атрыманых ран.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### З камбайнаў злілі паліва

У Аршанскім раёне ноччу супрацоўнікамі міліцыі былі затрыманы зладзеі, якія з двух камбайнаў «КСЗ-10К», якія знаходзіліся на полі, скралі каля 200 літраў дызельнага паліва. Шкоду ў гаспадарцы ацанілі на суму больш за мільён рублёў. Заведзена крымінальная справа. Выкрадзенае канфіскавана.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

### Браў, пакуль не спынілі...

Камітэтам дзяржаўнай бяспекі спынена незаконная дзейнасць старшага інспектара УДФР Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці. Паводле інфармацыі прэс-службы УКДБ па Гродзенскай вобласці, супрацоўнік фінансавай міліцыі быў затрыманы пры атрыманні незаконнага грашовага ўзнагароджання ў памеры 570 амерыканскіх долараў. У ходзе следства ўстаноўлена, што на працягу 2011—2012 гадоў ён неаднаразова атрымліваў у якасці хабару ад аднаго з жыхароў г. Гродна матэрыяльныя каштоўнасці і грашовыя сродкі за вырашэнне пытання аб зацягванні следства і спыненні расследавання ў дачыненні яго крымінальнай справы. Упраўленнем Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці ў дачыненні да старшага інспектара была заведзена крымінальная справа. У выніку далейшых аператыўна-следчых дзеянняў упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці выяўлены дадатковыя эпізоды незаконнай дзейнасці супрацоўніка фінансавай міліцыі, у выніку чаго заведзена яшчэ адна крымінальная справа.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Майце на ўвазе

# НЕПАЎНАЛЕТНІМ ЦЯПЕР ЗАБАРАНЯЕЦЦА ЗНАХОДЗІЦЦА БЕЗ СУПРАВАДЖЭННЯ ДАРОСЛЫХ НА ВУЛІЦЫ Ў НАЧНЫ ЧАС

**Учора ўступіла ў сілу пастанова Саўміна № 772 ад 22 жніўня, згодна з якой асобам, якія не дасягнулі 16 гадоў, забараняецца знаходзіцца на вуліцы з 23.00 да 6.00 без суправаджэння дарослых.**

У МУС Беларусі лічаць, што гэта абмежаванне з'яўляецца ахоўнай мерай, а не камендацкай гадзінай. «Дзіця можа знаходзіцца па-за домам у позні час, але з паўналетнімі (бацькамі, дарослымі братамі або сёстрамі, знаёмымі). Галоўнае, каб бацькі ведалі, дзе і з кім знаходзяцца іх дзеці», — растлумачылі ў МУС. Такія меры дапамогуць абараніць дзяцей ад злачынных замахаў і зменшыць колькасць непаўналетніх, уцягнутых ва ўчыненне злачынстваў, паколькі падлеткі ў гэтым узросце найбольш падпадаюць пад дрэнны ўплыў.

Міліцыянер не будзе праводзіць затрыманне непаўналетніх у прывычным сэнсе гэтага слова. Супрацоўнік АУС будзе толькі суправаджаць малалетняга, паколькі правапарушэнне ў такіх выпадках дапускаюць бацькі. І менавіта ў дачыненні да іх будуць складацца пратаколы. «Пры сустрэчы непаўналетняга ў позні час на вуліцы супрацоўнік органаў унутраных спраў высветліць яго асобу і ўзрост. Бацькам пазвоняць, высветляць прычыну, па якой дзіця адно на вуліцы. Бацькі змогуць прыехаць на працягу 3 гадзін. У адваротным выпадку (напрыклад, месцазнаходжанне бацькоў не ўстанавілі, яны знаходзяцца ў стане ап'янення) дзіця даставяць у сацыяльна-педагагічны прытулак», — расказалі ў МУС. Забраць дзіця можа па даручэнні бацькоў любы дарослы. Міліцыянер пазвоніць бацькам, высветліць магчымасць прыехаць за дзіцем.

Дарослым, адказным за знаходжанне дзіцяці без нагляду ў позні час, у адпаведнасці з арт. 17.13 КоАП Беларусі (невыкананне абавязкаў па суправаджэнні ці забеспячэнні суправаджэння непаўналетняга ў начны час па-за жыллём), пагражае або папярэджанне, або штраф да дзвюх базавых велічынь (адна базавая складае Br100 тыс.). За паўторнае на працягу года парушэнне — ад дзвюх да пяці базавых. Складаць адміністрацыйныя пратаколы будуць супрацоўнікі міліцыі. Разгляд спраў аб названых правапарушэннях аднесены да кампетэнцыі камісій па справах непаўналетніх.

Паводле інфармацыі МУС, толькі за першае паўгоддзе гэтага года ў Беларусі ахвярамі злачынстваў сталі амаль 2 тыс. непаўналетніх. Каля 40 працэнтаў злачынстваў, учыненых дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў, адбыліся ў позні вячэрні і начны час.

**БЕЛТА**

■ Чым хварэем?

## КІШЭЧНЫЯ ІНФЕКЦЫІ АДСТУПАЮЦЬ

**У 2012 годзе запланавана прышчапіць ад грыпу не менш як 660 тысяч мінчан, або 35% ад агульнай колькасці насельніцтва горада. Як паведаміла загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірына Глінская, каля 29 % насельніцтва сталіцы будуць прышчэплены за кошт бюджэтных сродкаў: 142 тысячы чалавек — за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і 402 тысячы — за кошт гарадскога. Больш як 116 тысяч чалавек плануецца вакцынаваць за сродкі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, а таксама за асабістыя сродкі грамадзян.**

У цэлым санітарна-эпідэміялагічная сітуацыя ў сталіцы за апошнія сем месяцаў характарызуецца як стабільная. На гэтым фоне высокімі застаюцца паказчыкі па некаторых захворваннях, якія адносяцца да ліку малараспаўсюджаных. Так, колькасць хворых на коклюш павялічылася амаль у 6 разоў, на шкарлятыну — у 2,5 раза, на хранічны гепатыт В — у 2 разы. Калі гаварыць пра кішэчныя інфекцыі, то тут, наадварот, назіраецца паляпшэнне сітуацыі: колькасць выпадкаў ротавіруснай інфекцыі зменшылася ў 2,3 раза, сальманэлёзу — у 1,3 раза, энтэравіруснай інфекцыі — у 1,5 раза.

**Алена ДРАПКО**

■ Дэмаграфічная небяспека

# НАС ЗАСТАЕЦЦА ЎСЁ МЕНШ...

**У сучасным свеце існуе шмат праблем. Але, бадай, галоўная з іх — дэмаграфічная. Яна актуальная як для Беларусі, так і для Мінскай вобласці. Нас не можа не хваляваць, што апошнія дзесяцігоддзі сітуацыя характарызуецца адмоўным прыростам насельніцтва. Гэта вынік высокай смяротнасці і нізкай нараджальнасці.**

— У адпаведнасці з крытэрыямі ААН, калі насельніцтва краіны складае менш за 10 мільёнаў, то нацыя пераходзіць у катэгорыю малаколькаснай і выміраючай. У гэтым сэнсе беларусы ў аўтсайдарах Еўропы. Але дэмаграфічныя праблемы ў Беларусі ў цэлым і на Міншчыне ў прыватнасці ўзніклі не сёння, — нагадаў на пасяджэнні аблвыканкама, дзе разглядалася пытанне выканання Праграмы дэмаграфічнай бяспекі вобласці на 2011—2015 гады, губернатар Міншчыны Барыс Батура. — Мы не ўзнаўляем сваё насельніцтва ўжо больш за 30 гадоў. Сёння гэты паказчык на ўзроўні 65,5% ад неабходнага.

Што датычыцца Мінскай вобласці, тут тэмпы скарачэння насельніцтва замаруджваюцца. Для параўнання: у 2010 годзе рэгіён страціў 8,3 тыс. чалавек, летась — 8 тысяч. Сёлета за паўгода жыхароў Міншчыны паменела на 1,6 тыс. чалавек. Але за аналагічны перыяд летась — на 2,5 тысячы. На думку спецыялістаў, паказчык палепшыўся за кошт стабілізацыі ўзроўню нараджальнасці. Па выніках 2011 года яна склала 11,9 праміле (1 выпадак на 1000 чалавек), за шэсць месяцаў гэтага года ўжо 12,1.

Самы высокі за апошнія пяць гадоў каэфіцыент нараджальнасці абумоўлены дзяржаўнай сацыяльнай адраснай падтрымкай. Іх атрымліваюць сем'і, што выхоўваюць дзяцей, малазабяспечаныя і няпоўныя сем'і. Асобным катэгорыям грамадзян прадастаўляюцца льготныя крэдыты на будаўніцтва жылля. Толькі летась на падрыхтоўку дзяцей да новага навучальнага года 10,4 тыс. сем'яў выдаткавана 2,2 млрд рублёў. У калектыўных дагаворах прадпрыемстваў для бацькоў, якія маюць непаўналетніх дзяцей, прадугледжаны гібкія графікі работы, дадатковы водпуск, беспрацэнтныя крэдыты, аднačасовыя выплаты пры нараджэнні дзяцей і шмат іншых сацыяльных гарантый.

Разам з тым, пакуль што ў рэгіёне колькасць памерлых перавышае колькасць нованароджаных у 1,3 раза. Кожны пяты пайшоў на той свет у працаздольным узросце. На 3,8% павялічылася колькасць самазабойстваў. Паранейшаму шмат людзей гіне на дарогах у выніку аварый, пажараў, траўматызму на рабочых месцах. Як вынік, працягласць жыцця на Міншчыне — 69,3 года супраць прагнознага паказчыка — 70,5 года, і колькасць насельніцтва працягвае скарачацца. Гэтыя працэсы не перакрываюць нават міграцыйныя прытокі грамадзян.

Акрамя таго, у 9 раёнах вобласці назіраецца зніжэнне нараджальнасці. Не забяспечана планавае паэтапнае скарачэнне смяротнасці ў 16 рэгіёнах. У чым прычына? На думку губернатара, на месцах не праяўляюць ініцыятыву, не дбаюць пра паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі з улікам асаблівасцяў кожнага рэгіёна. Тым часам канкрэтныя захады былі б добрым дадаткам да таго, што прымаецца на ўзроўні кіраўніка дзяржавы і ўрада. Як адзначыў Барыс Батура, мала ўвагі надаецца прапагандзе здаровага ладу жыцця, сямейных каштоўнасцяў, культуры харчавання, прыцягненню людзей да заняткаў фізкультурай і спортам. Мы не можам нічога супрацьпаставіць таму ж п'янству і алкагалізму. Продаж алкаголю на душу насельніцтва на Міншчыне складае да 12,4 літра пры крытычным узроўні ў 8 літраў. Эксперымент па забароне рэалізацыі моцных вінаў з садавіны і ягад спачатку ў Слуцку, а затым і ў іншых рэгіёнах даў пэўны вынік. Але толькі забароннымі метадамі праблему не вырашыш. На жаль, кіраўнікі рознага ўзроўню недаацэньваюць магчымасцяў прапаганды, сацыяльнай рэкламы. Яна павінна будавацца на тых жа прынцыпах, што і камерцыйная. Нават дарослыя людзі з устойлівым светапоглядам таксама кідкія на сумнеўнай якасці чыпсы, піва, розныя напоі, якія прапаноўваюцца з экранаў тэлевізара. Значыць, умеюць піяршчыкі паказаць свой прадукт з найлепшага боку. А мы не можам зрабіць сацыяльную рэкламу больш пераканаўчай і высокамастацкай, якая б біла не ў брыво, а ў вока — на прыкладзе зламаных лёсаў наркаманаў, алкаголікаў, зняволеных і іх сем'яў. Разам з тым, трэба паказаць, што з любой сітуацыі ёсць выйсце, калі чалавек задумаецца над сваімі паводзінамі і знойдзе сілы парваць з мінулым. Зразумела, не ўсе антысацыяльныя элементы паддаюцца выхаванню. У гэтым выпадку варта падумаць, як абараніць дзяцей і моладзь, як накіраваць іх энергію ў стваральнае рэчышча.

Культуру здаровага ладу жыцця павінен дэманстраваць і сам кіраўнік прадпрыемства, арганізацыі, навучальнай установы, каб быць прыкладам для сваіх падначаленых. Прынамсі, за мяжой агульначалавечыя каштоўнасці прапагандуюцца па тэлебачанні з удзелам дзяржаўных чыноўнікаў, службоўцаў: прабежкі, якаснае харчаванне і г.д. Сёння ў вобласці сярод асноўных прычын смерці — сардэчна-сасудзістыя захворванні, злаякасныя новаўтварэнні. А гэта вынік лішняй вагі, ужывання алкаголю, няякаснай вады і ежы, стрэсаў.

Як сцвярджаюць спецыялісты, на дэмаграфічную сітуацыю ўплываюць сацыяльныя фактары. Такія, як нізкі ўзровень жыцця, паўсядзённыя цяжкасці, нізкія заробкі. Задача дзяржавы — стварыць чалавеку годныя ўмовы адпачынку і працы, каб ён мог добра зарабляць, утрымліваць сваю сям'ю. Гэтаму ў вобласці надаецца ўвага, робяцца захады для забеспячэння якасці харчовай сыравіны і прадуктаў, вады. Разам з тым, па ацэнцы экспертаў, у 85% выпадкаў у сваіх праблемах вінаваты і самі людзі. Ствараецца ўражанне, што многія забылі пра элементарнае пачуццё самазахавання, працяг роду. Ігнаруючы элементарныя правілы бяспекі, яны гінуць у дарожна-транспартных здарэннях, агні, тонуць у вадзе... І перарываецца «нітачка», якая звязвае кожнага з нас з нашымі нашчадкамі...

## У тэму

**За апошнія 15 гадоў у Мінскай вобласці патанула больш за 2600 чалавек. Калі ўдумацца, гэта цэлы пасёлак. А за шэсць месяцаў сёлета на вадзе загінула 44 грамадзяніны, у тым ліку 28 у нецвярозым стане. Самае балючае, што ўсе яны былі працаздольнага ўзросту, але з іх меў працу толькі адзін. На думку старшыні Мінскага абласнога савета Беларускага таварыства выратавання на водах Сяргея Паўлюкевіча, гэта ўжо праблема не толькі выратавальнікаў, але і дзяржавы, грамадскасці.**

— На Міншчыне дзейнічае 7 выратавальных станцый і 16 пастоў. У іх зонах не зафіксавана ніводнага выпадку гібелі людзей. Але мы не можам паставіць такія «заслоны»на кожным вадаёме. У сталічнай вобласці плошчу ў 95 тыс. гектараў займае вада: азёры, вадасховішчы, рэкі. Трэба, каб самі людзі захоўвалі правілы паводзін, — канстатуе спецыяліст.

А яны, дарэчы, простыя: быць максімальна асцярожным, як у той прымаўцы «Не ведаеш броду — не лезь у ваду». Нягледзячы на тлумачальную работу, шматлікія папярэджанні, выступленні ў сродках масавай інфармацыі, дарослыя людзі насуперак здароваму сэнсу і логіцы нібы самі шукаюць пагібелі. Да таго ж, за паўтара года міліцыяй не аштрафаваны ніводзін чалавек, які купаўся ў забароненых месцах. Хоць адпаведным артыкулам адміністратыўнага Кодэкса прадугледжана пакаранне ў памеры ад 1 да 3 базавых велічынь.

На думку Сяргея Паўлюкевіча, больш жорсткім павінна быць заканадаўства ў дачыненні да такіх парушальнікаў. Напрыклад, калі вадзіцель за рулём не прывязаны рэменем бяспекі, то яму пагражае штраф. А вось калі чалавек садзіцца ў лодку без засцерагальнай камізэлькі, то яго за гэта ніхто не можа пакараць.

Многае залежыць і ад стану пляжаў. У Жодзіне, напрыклад, месца для купання добраўпарадкавана: ёсць кабінкі для пераапранання, сметніцы, дзяжурыць міліцыя. Але падобнае далёка не ўсюды. І калі месцы адпачынку не абсталяваны самым элементарным і забруджаны, то людзі, бясспрэчна, ідуць на так званыя дзікія пляжы, за што потым расплачваюцца сваім жыццём.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

# У 63 ГАРАДАХ І 20 МЯСТЭЧКАХ — НАТУРАЛЬНЫ ПРЫРОСТ НАСЕЛЬНІЦТВА

**Натуральны прырост насельніцтва Беларусі зафіксаваны ў студзені—ліпені гэтага года ў 63 са 112 гарадоў і ў 20 з 92 пасёлкаў гарадскога тыпу, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандрацёнка.**

Колькасць народжаных кампенсавала колькасць памерлых у г. Васілевічы Рэчыцкага раёна і двух пасёлках гарадскога тыпу (Янавічы Віцебскага раёна і Наваельня Дзятлаўскага раёна). Натуральны прырост сельскага насельніцтва адзначаны ў Мінскім (478 чалавек) і Брэсцкім (19 чалавек) раёнах.

Колькасць насельніцтва рэспублікі на 1 жніўня гэтага года склала 9 млн 457,1 тыс. чалавек.

Паводле слоў спецыяліста, у дэмаграфічнай сітуацыі ў апошнія гады назіраюцца пазітыўныя тэндэнцыі: павялічылася нараджальнасць, знізілася смяротнасць і, як вынік, — зменшылася страта насельніцтва. Менавіта ў 2011 годзе дасягнута найменшая за апошнія 10 гадоў страта насельніцтва — 16 тыс. чалавек. Прычым скарачэнне страты назіраецца ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі.

З 2004 года намецілася павелічэнне колькасці нараджэнняў. Так, у мінулым годзе нарадзіліся 109,1 тыс. дзяцей. У студзені—ліпені гэтага года нарадзіліся 64,4 тыс. — на 4 тыс. больш, чым у студзені—ліпені 2011 года. У выніку агульны каэфіцыент нараджальнасці дасягнуў у мінулым годзе 11,5 на 1000 жыхароў рэспублікі, а ў студзені—ліпені 2012 года — 11,7 праміле.

Павелічэнню колькасці нараджэнняў у рэспубліцы спрыяў рост інтэнсіўнасці дзетараджэння. Так, колькасць народжаных на 1000 жанчын дзетароднага ўзросту (15-49 гадоў) вырасла з 33,6 у 2002 годзе да 45,1 у 2011 годзе. Доля дзяцей, якія нарадзіліся па парадку другімі, трэцімі і г.д., у штогадовай колькасці нованароджаных дасягнула 49 працэнтаў. За апошнія 10 гадоў колькасць абортаў знізілася ў 3 разы.

Важным аспектам, які характарызуе дэмаграфічную сітуацыю, з'яўляецца смяротнасць насельніцтва. Пачынаючы з 2003 года адзначаецца стабілізацыя паказчыка смяротнасці насельніцтва з паступовай дынамікай зніжэння. Так, у студзені—ліпені гэтага года ў параўнанні са студзенем—ліпенем 2011 года агульны каэфіцыент смяротнасці знізіўся з 14,6 да 13,5 памерлых на 1000 чалавек насельніцтва. Колькасць памерлых за гэты перыяд склала 74,5 тыс. чалавек і ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года знізілася на 5,7 тыс. чалавек.

Станоўчай тэндэнцыяй з'яўляецца скарачэнне смяротнасці працаздольнага насельніцтва ў студзені—ліпені 2012 года на 17,3 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года. За сем месяцаў гэтага года ў працаздольным узросце памерлі 15,7 тыс. чалавек, або кожны пяты з усіх памерлых у рэспубліцы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Падпіска—2012

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 8 верасня па 31 снежня 2012 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2012 года.

2. Арганізатар Гульні — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

## II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — установы «Рэдакцыя газеты «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Фен SCARLETT SC-076 Rose | 7 | 50 280 | 351 960 |
| 2. | Пыласос SCARLETT SC-087 Red | 7 | 288 960 | 2 022 720 |
| 3. | Параварка SCARLETT SC-142 White | 1 | 207 720 | 207 720 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 2 582 400 (Два мільёны пяцьсот восемдзесят дзве тысячы чатырыста) беларускіх рублёў.

## III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2012 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2012 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпіснoй кампаніі на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2012 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца ў газеце «Звязда» да двух разоў на тыдзень у перыяд з 8 верасня па 3 кастрычніка 2012 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ў рэдакцыю пасля 8 кастрычніка 2012 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

## IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Здановіч Уладзімір Аляксандравіч — намеснік галоўнага рэдактара ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Пракапеня Алена Уладзіміраўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела пісьмаў установы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — загадчык вытворчага аддзела ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Салаўёва Таццяна Уладзіміраўна — вядучы рэдактар тэхнічны ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Дзевойна Алена Уладзіміраўна — рэдактар аддзела прававой і кадравай работы ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда».

10. Камісія кіруецца ў сваёй дзейнасці рэгламентам (раздзел V гэтых Правілаў).

11. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

## V. РЭГЛАМЕНТ РАБОТЫ КАМІСІІ

12. Камісія ажыццяўляе кантроль за захаваннем вызначаных правілаў правядзення рэкламнай гульні, вызначае пераможцаў Гульні, якія выйгралі прыз, разглядае скаргі і спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць падчас правядзення Гульні.

13. Пасяджэнні Камісіі вядзе старшыня. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці членаў з яе зарэгістраванага складу.

14. Члены Камісіі абавязаны: прымаць удзел у пасяджэннях Камісіі, забяспечваць падчас Гульні адпаведнасць парадку яе правядзення гэтым Правілам, вызначыць пераможцаў Гульні, якія выйгралі прызы, прымаць удзел у разглядзе скаргаў (пры іх наяўнасці) удзельнікаў, падпісваць пратаколы пасяджэнняў Камісіі.

15. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца ўдзельнікі Гульні, прадстаўнікі незалежных арганізацый.

16. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

17. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

## VI. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

18. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 10 кастрычніка 2012 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

19. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

20. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываецца па адным фене і пыласосе.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — параварка.

21. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

22. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 20 кастрычніка 2012 года ўключна ў газеце «Звязда».

Арганізатар у тэрмін да 20 кастрычніка 2012 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

## VII. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

23. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2012 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможца ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2012 года.

24. Адсутнасць у пераможца, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2012 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

25. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 снежня 2012 года ў памяшканні Рэдакцыі па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, Арганізатар не аплачвае.

26. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

27. Пасля 31 снежня 2012 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

## VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

28. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за падачу падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

29. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фотаздымкі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

30. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

31. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 2051 ад 28.08.2012 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.*

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету**

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2012 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ________ руб. | Колькасць камплектаў |
|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ________ руб. | |

на 2012 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Жанна РАМАНОВІЧ:

■ Прамая лінія

# «УСЁ, НА ШТО ВЫ МАЕЦЕ ПРАВА, ВАМ ВЫПЛАЦЯЦЬ...»



**«Як можна павялічыць пенсію?» «Кажуць, што пенсіянерам, якія працуюць, неўзабаве пенсію не будуць выплачваць, гэта праўда?» І нават — «як падлічвалі ў калгасе працадні ў 1964 годзе»? З якімі толькі пытаннямі не тэлефанавалі нашы чытачы на прамую лінію «Аб пенсіях і не толькі» — са старшынёй камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жаннай РАМАНОВІЧ... І ніводнае з іх не было пакінута без адказу.**

Мы вырашылі апублікаваць адказы на самыя папулярныя пытанні, якія могуць зацікавіць і іншых нашых чытачоў.

***Лілія Пятроўна, г. Мінск: Я на пенсіі з мінулага года, зараз не працую. Маю бесперапынны стаж, які складае 36 гадоў 11 месяцаў 6 дзён. Да лічбы 37 гадоў не хапае ўсяго 24-25 дзён. У сувязі з гэтым пытанне: калі я магу дапрацаваць умоўна месяц? На колькі можа павялічыцца памер пенсіі і ці павялічыцца ўвогуле (сёння мая пенсія крыху меншая за сярэднюю па рэспубліцы)?***

— У выпадку, калі вы прымеце для сябе рашэнне дапрацаваць стаж да 37 поўных гадоў, вам неабходна звярнуцца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па месцы жыхарства з заявай аб прыпыненні выплаты пенсіі на 24 дні. Па заканчэнні гэтага тэрміну па вашай заяве будзе аднаўлена выплата пенсіі і здзейснены яе пераразлік.

У вашым выпадку памер прызначанай пенсіі ў параўнанні з яе папярэднім памерам павялічыцца на 1% заробку і складзе 72% заробку, вылічанага па вызначаных нормах. Канкрэтны памер павелічэння залежыць ад велічыні вашага індывідуальнага каэфіцыента заробку. Калі зыходзіць з сярэдніх паказчыкаў па горадзе Мінску, гэтая сума можа скласці 25 000-30 000 рублёў у месяц.

***Таццяна Мікалаеўна, г. Мінск: Ці абавязкова пасля падпісання дагавора пажыццёвага ўтрымання (рэнты) трэба ехаць жыць у інтэрнат?***

— Не, гэта не абавязкова. У нас ёсць дзве формы дагавора пажыццёвага ўтрымання пажылога чалавека. Адна — гэта калі чалавек пакідае сваю кватэру і пераязджае жыць у інтэрнат на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне. Другая — калі грамадзянін, складаючы такі дагавор, застаецца жыць у сваёй кватэры. А тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва прымае на сябе абавязацельствы па яго доглядзе, сацыяльным абслугоўванні. Пры гэтым дзяржава выплачвае яму рэнтавую плату ў памеры ад 1 да 3 базавых велічынь, а таксама прымае на сябе абавязацельствы па аплаце камунальных паслуг. Акрамя таго, чалавек цалкам атрымлівае сваю пенсію, сам падбірае поўны набор паслуг, якія б хацеў атрымаць. Усё гэта ён атрымлівае, знаходзячыся дома, у звыклай абстаноўцы. Я лічу, гэта вельмі ўдалы варыянт для адзінокага пажылога чалавека. Ён знаходзіцца пад наглядам і ў любы момант можа атрымаць падтрымку і неабходную дапамогу. Пры гэтым ён застрахаваны ад усялякіх жулікаў, якія падманнымі шляхамі імкнуцца завалодаць жыллём адзінокіх старых.

Калі ж чалавека не задавальняе тое, як яго абслугоўваюць, ён можа перапыніць гэты дагавор. Праўда, для гэтага трэба звярнуцца ў суд, каб даказаць, што яго ўмовы не выконваюцца.

***Аляксей, г. Мінск: Калі плануецца ўвесці ў дзеянне закон аб выплаце дапамогі на дзяцей да трох гадоў па новых правілах?***

— Новая рэдакцыя Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» уступіць у сілу з 01.01.2013 года.

***Ганна Васільеўна Бібік, Любанскі р-н, в. Сосны-1: Хачу даведацца пра даплату да пенсіі за дасягненне 75-гадовага ўзросту. У ліпені атрымала 1.760.000 рублёў пенсіі, а ў жніўні — 2.056.000 рублёў. Па маіх падліках, даплаты ніякай няма, ёсць толькі тыя працэнты, на якія павысілася пенсія ў жніўні...***

— З 1 студзеня 2012 года да пенсій непрацуючых пенсіянераў, якія дасягнулі 75 гадоў, устаноўлены даплаты ў памеры 75% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросту. У ліпені бягучага года мінімальны памер пенсіі па ўзросце склаў 185.755 рублёў, у жніўні — 210.968 рублёў. Такім чынам, памер павышэння склаў 139.316 рублёў і 158.226 рублёў адпаведна.

Адначасова з 1 жніўня гэтага года праведзены пераразлік працоўных пенсій, зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за II квартал (яны павялічыліся на 17%). Але майце на ўвазе: пераглядаўся толькі асноўны памер пенсіі (без уліку надбавак і павышэнняў). Што тычыцца вашай сітуацыі, асноўны памер вашай пенсіі ў ліпені быў 1.620.684 рублі, а ў жніўні склаў 1.897.774 рублі г.зн. павялічыўся на 17%. Дадайце да гэтай лічбы 158.226 рублёў даплаты ... Як бачыце, Вам усё правільна выплацілі.



***Марына Якубоўская, г. Мінск: Бачыла ў СМІ інфармацыю аб тым, што ў Мінску будзе адкрыта аддзяленне дзённага знаходжання для пажылых людзей. Гэтае пытанне ўжо вырашана? Дзе плануецца адкрываць такія аддзяленні, на якіх умовах туды будуць прымаць старых, як будзе наладжана харчаванне?***

— Аддзяленні дзённага знаходжання для пажылых грамадзян мы плануем адкрыць на базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага і Першамайскага раёнаў Мінска.

Гэта новая форма сацыяльнага абслугоўвання, на дзяржразліковай аснове. Зараз распрацоўваюцца тарыфы. У аддзяленні будзе абсталяваны пакой для прыёму ежы (харчаванне за кошт тых, хто там знаходзіцца). Вы будзеце дастаўляць туды бацькоў (калі гэта вас датычыць) сваім транспартам на пару гадзін альбо на цэлы дзень — як вам зручней. Пажылыя людзі змогуць сабе знайсці занятак: на базе тэрытарыяльных цэнтраў у нас шырока развіта сетка клубаў па інтарэсах, гурткоў, секцый. Можна будзе скарыстацца фізкультурнай і чытальнай заламі, пакоем для адпачынку...

***Вольга Сцяцко, г. Мінск: Ці даступныя ў Мінску паслугі сацыяльнай сядзелкі? Якія расцэнкі на іх? Хто можа на іх разлічваць?***

— Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёнаў г. Мінска аказваюць непрацаздольным грамадзянам, якія страцілі здольнасць да самаабслугоўвання, паслугі сядзелкі за кошт сродкаў, атрыманых ад дзейнасці, якая прыносіць даходы.

Кошт норма-гадзіны паслуг сядзелкі складае ў дзённы час па буднях — 19 980 рублёў, у начны час — 23 250 рублёў, у выхадныя і святочныя дні — 28 140 рублёў.

Аказанне паслуг сядзелкі ажыццяўляецца на падставе асабістай заявы грамадзяніна і дагавора аб абслугоўванні ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам.

І, дарэчы, Цэнтры здзяйсняюць пакрыццё фактычных выдаткаў у памеры да бюджэту пражытковага мінімуму (далей — БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва, які дзейнічае на дату падачы заявы, непрацаздольным грамадзянам, што цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння, на аплату паслуг сядзелкі адзін раз на месяц (нагадаю, што на 01.08. 2012 БПМ складае 843.870 рублёў).

***Мікалай Дзігалеў, г. Бабруйск: У мяне два пытанні. Першае: я чуў, што дзецям, якія нарадзіліся ў Мінску, да дасягнення 3-х гадоў прадастаўляецца бясплатнае малако і памперсы. А вось калі дзіця нарадзілася ў Бабруйску — даецца толькі малако, а памперсы — не. Чаму?***

— З мэтай сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый жыхароў Мінска была прадугледжана штомесячная выплата сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 1 года. Гэты від дапамогі сярод жыхароў сталіцы атрымаў назву «выплата на памперсы». Яе памер складаў розніцу паміж велічынямі бюджэту пражытковага мінімуму і дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. З 1 студзеня 2010 года, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі № 642, дапамога па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца ў памеры 100% велічыні бюджэту пражытковага мінімуму. У сувязі з павелічэннем памеру дапамогі «выплата на памперсы» ў Мінску ўжо не прадастаўляецца.

***... І другое пытанне, якое мяне цікавіць: калі пенсіянер — інвалід І групы або дасягнуў 80 гадоў і не можа сябе абслугоўваць самастойна, аддзел сацыяльнага забеспячэння прызначае яму работніка, які яго даглядае. Гэты работнік атрымлівае вельмі маленькую зарплату, менш за 1 млн рублёў. Ці можа ён пражыць на гэтыя грошы? Пры гэтым ён не мае права працаваць больш нідзе. У мяне пытанне: чаму нельга такому сацыяльнаму работніку працаваць па сумяшчальніцтве ў іншай арганізацыі?***

— У вашым пытанні бачна падмена паняццяў «сацыяльны работнік» і «атрымальнік дапамогі па доглядзе інваліда І групы або састарэлага, старэйшага за 80 гадоў». Атрымальнік дапамогі па доглядзе — гэта чалавек, які пакінуў працу для таго, каб даглядаць непрацаздольнага сваяка. І такая дапамога — гэта від сацыяльнай выплаты, калі дзяржава падтрымлівае чалавека, які ў сілу жыццёвых абставін страціў крыніцу сродкаў да існавання з-за вымушанага догляду непрацаздольнага. Памер яе вызначаны з улікам магчымасцяў рэспубліканскага бюджэту і складае ў цяперашні час пры ажыццяўленні догляду аднаго непрацаздольнага 843.870 руб., дваіх і больш — 1.012.640 руб. Рэзерваў для істотнага яе павышэння ў цяперашні час, на жаль, не маецца.

Але вырашыць праблему можна і іншым спосабам: не пакідаць працу, атрымліваць больш высокі даход і скарыстацца паслугамі сацыяльнага работніка або сядзелкі, даверыўшы ім догляд непрацаздольнага члена сям'і.

***Аксана Леанідаўна, г. Віцебск: У якім памеры аказваецца дапамога па доглядзе дзіцяці, калі той, хто знаходзіцца ў водпуску па доглядзе, выходзіць на працу да дасягнення дзіцем 3-х гадоў?***

— У такой сітуацыі памер выплаты складзе 50% дапамогі. Для поўнай сям'і — гэта 421 940 рублёў, для адзінокіх маці — 738 390 рублёў.



***Таісія Мамонька, г. Мінск: У адпаведнасці з Указам № 35 вызначана штомесячная дадатковая мэтавая даплата да пенсій непрацуючых пенсіянераў, якія дасягнулі 75 (80) гадоў. Ці захоўваецца ў такім выпадку надбаўка, устаноўленая ў адпаведнасці з арт. 25 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні»?***

— Даплата па Указе Прэзідэнта Беларусі № 35 выплачваецца незалежна ад вызначаных да пенсіі ў адпаведнасці з заканадаўствам надбавак і павышэнняў. Так, у жніўні бягучага года грамадзянін, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту, атрымаў да пенсіі дадаткова 316.450 рублёў (210.968 рублёў — даплата па Указе, 105.484 рублі — надбаўка на догляд у адпаведнасці з арт. 25 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні»). Адзінокі пенсіянер, які дасягнуў 75-гадовага ўзросту і мае патрэбу па заключэнні МРЭК у пастаяннай старонняй дапамозе, атрымаў да пенсіі дадаткова 263.710 рублёў (158.226 рублёў — даплата па Указе, 105.484 рубля — надбаўка на догляд у адпаведнасці з арт. 25 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні»).

**На 01.08.2012 г. сярэдні памер пенсій усіх відаў складае ў сталіцы 1.756.333 руб. Па рэспубліцы ён традыцыйна крыху ніжэй — 1.657.253 руб.**

***Ядзвіга Браніславаўна, Лідскі р-н: Тым, каму споўнілася 75 (80) гадоў, у першым квартале давалі даплату да пенсіі. Мы нават распісваліся за яе ў асобнай ведамасці. А ў другім квартале нам ужо яе не далі. І ў трэцім таксама мы яе не атрымалі. Мы не можам разабрацца, як даюць гэтую даплату: раз на квартал або раз на год?..***

— Указам Прэзідэнта з 1 студзеня гэтага года вызначаны даплаты да пенсій непрацуючых атрымальнікаў, старэйшых за 75 гадоў. Яны выплачваюцца штомесяц разам з пенсіяй і ўключаюцца ў агульную ведамасць. Гэта адзіны для ўсёй рэспублікі парадак, і я не думаю, што ў Гродзенскай вобласці яны былі выплачаны асобна. Разам з тым па ўдакладненне вам неабходна звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

***Алена Георгіеўна, Гродзенская вобл.: Інвалідам 2 групы можна карыстацца пуцёўкамі ў санаторый. Я на 2 групе з 1995 года. Ехаць нікуды не магу. Ці можна зрабіць так, каб мне далі замест пуцёўкі нейкую суму на таблеткі і ўколы?***

— Кампенсацыя за нявыкарыстаныя пуцёўкі інвалідам II групы не прадугледжана. Разам з тым, калі вы адзінокі чалавек і знаходзіцеся ў цяжкім матэрыяльным становішчы, можаце звярнуцца па аказанне аднаразовай грашовай дапамогі са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства.

***Віктар Кельнік, Лідскі р-н, в. Мастаўляны: У мяне зусім маленькая пенсія. Мне ўсё адказваюць, маўляў, маленькі заробак быў. Але мне крыўдна, 42 гады прапрацаваў у жывёлагадоўлі, на ферме — і атрымліваю пенсію 1 200 000 рублёў?***

— Трэба глядзець вашу пенсійную справу. Мы звяжамся з калегамі з Гродзенскай вобласці. Не магу абяцаць, што пенсію вам павялічаць, а вось праверыць правільнасць яе разліку паспрабуем. Усё, на што вы маеце права, атрымаеце.

***Анатоль Канстанцінавіч Шкут, г. Мінск: У 1964 годзе я вучыўся ў вячэрняй школе і адначасова пайшоў працаваць у калгас. Мяне цікавіць пытанне: як падлічвалі працадні ў той час? Я амаль год працаваў у паляводстве, потым скончыў вучылішча і працаваў на трактары ў калгасе ...***

— Вы ўжо звярталіся з гэтым пытаннем у органы сацыяльнай абароны?

**— Я падаваў усе звесткі, калі выходзіў на пенсію, але на гэтае пытанне я не ведаю адказу, яно мяне цікавіць ...**

— Паважаны Анатоль Канстанцінавіч, мы паглядзім, якую даведку аб колькасці працадзён выдаў вам калгас, установім, як гэты перыяд уключаны ў ваш стаж, і вам патэлефануем. У вашым выпадку важна, ці былі вы ў 1964 годзе членам калгаса і калі ў яго прымаліся.

***Валянціна Нарбут, Іўеўскі р-н, в. Жамыславы: 20 жніўня я здала дакументы на пенсію. Сярод іх — даведка аб тым, што даглядала адзінокую 80-гадовую бабульку з 30.03.1998 па 31.12.2000. Гэтую даведку мне выдалі ў сакавіку 2000 года. У працоўнай кніжцы запісу не рабілі. Цяпер у аддзеле сацыяльнага забеспячэння мне кажуць, што гэты час па доглядзе ў працоўны стаж не ўключаецца, калі няма заключэння ўрачоў. А тады ж ніякага заключэння не патрабавалася. Калі б яно было трэба, я б зрабіла яго. Чаму так? Бабуля даўно памерла, дзе я сёння вазьму гэтае заключэнне?***

— Сапраўды, у пенсійны закон унесены змены, і з 01.08.2006 г. абавязковай умовай для заліку ў стаж часу догляду 80-гадовага старога з'яўляецца наяўнасць медыцынскага заключэння аб яго патрэбе ў пастаянным доглядзе. У вашым выпадку рэкамендую звярнуцца ў паліклініку, дзе была на ўліку ваша падапечная. Магчыма, неабходнае заключэнне будзе падрыхтавана на падставе архіўных медыцынскіх дакументаў.

***Людміла Леанідаўна, г. Ганцавічы: Я 2 гады на пенсіі, але працую, настаўніца. Ці не можа атрымацца ў бліжэйшы час так, што пенсіянерам, якія працуюць, скажуць: або пенсія, або зарплата?***

— Ні ў якім разе так не будзе. З 1 кастрычніка ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта «Аб мерах удасканалення пенсійнага забеспячэння». Згодна з Указам, вы маеце права выбіраць: альбо сыходзіць на пенсію і не працаваць, альбо сыходзіць на пенсію і працаваць, альбо адмовіцца ад пенсіі і назапашваць яе на будучыню. Гэта на ваш выбар. Таму не хвалюйцеся, калі ласка.

**Святлана БУСЬКО.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

***Яўгенія Малышава, г. Мінск: У каго пенсіі самыя высокія, у каго самыя нізкія, колькі яны складаюць? І колькі ў Мінску прыпадае пенсіянераў на работнікаў (колькі з іх працуюць)?***

— Сярэднія памеры пенсій, прызначаных розным катэгорыям атрымальнікаў, істотна адрозніваюцца. Так, сярэдні памер працоўнай пенсіі па ўзросце ў Мінску ў жніўні гэтага года склаў 1.777.156 руб., у той час як мінімальная пенсія па ўзросце са штомесячнай даплатай — 915.018 руб. Значна ніжэй памеры сацыяльных пенсій — 785.680 руб.

Памер пенсіі кожнага пенсіянера вызначаецца індывідуальна і залежыць ад працягласці працоўнага стажу і велічыні заработнай платы. Акрамя гэтага, цяпер пенсійным заканадаўствам прадугледжана магчымасць самастойна ўплываць на памер сваёй будучай пенсіі шляхам «адкладзенага» выхаду на яе. Так, калі чалавек дасягнуў пенсійнага ўзросту і не атрымлівае пенсію, то за кожныя два месяцы працы яе памер павялічваецца на 1% заробку, прынятага для вылічэння пенсіі. Хачу адзначыць, што ў нашым горадзе ёсць грамадзяне, якія скарысталіся гэтай нормай, і памер іх пенсіі ў жніўні складае больш за пяць мільёнаў рублёў. А з 1 кастрычніка ўступіць у сілу Указ № 136, які прадугледжвае больш прагрэсіўнае павелічэнне памеру пенсіі ў выпадку працягу працы без атрымання пенсіі.

Што тычыцца колькасці сталічных пенсіянераў, то ў органах сацыяльнай абароны Мінска на 01.08.2012 г. на ўліку знаходзяцца 434.509 атрымальнікаў пенсій, з іх 157 100 (ці 36%) працягваюць працаваць.

На пачатак бягучага года колькасць працаздольнага насельніцтва ў горадзе складала 1222,1 тыс. чалавек (ці 64,8% у агульнай колькасці насельніцтва). Зараз у Мінску адбываецца павелічэнне нагрузкі на насельніцтва ў працаздольным узросце за кошт павелічэння колькасці пажылых людзей. Калі ў 1999 годзе на 1000 чалавек насельніцтва ў працаздольным узросце прыпадала 247 пенсіянераў, то на пачатак 2012 года — ужо 317 чалавек.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА



■ Шануй сваё!

**Да турыстычнага буму гораду над Нёманам яшчэ далёка, але і тое, што да яго неабыякавыя жыхары іншых рэгіёнаў нашай краіны, госці з-за мяжы — таксама відавочна. Прыязджаюць і ў складзе арганізаванай тургрупы, і ўласным транспартам, альбо, напрыклад, цягніком з беларускай сталіцы, каб паблукаць дзянёк па старажытным горадзе, убачыць яго гістарычныя помнікі, «фішкі», а ўвечары накіравацца дахаты. Цікава, што яны возьмуць з сабой, акрамя тых ці іншых уражанняў? Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся, якія сувеніры прапануюцца ў Гродне.**

# ГАРАДЗЕНСКІЯ СУВЕНІРЫ:
## шырокі выбар і беларускі каларыт

Угэтае, так бы мовіць, падарожжа па сувеніры накіроўваюся ад чыгуначнага вакзала. Менавіта адсюль для многіх гасцей, якія прыбылі «сваім ходам», пачынаецца турызм. Куды ж ім накіраваць свае зацікаўленыя вочы, як знайсці дарогу да тых ці іншых аб'ектаў, не пытаючы ў мясцовых жыхароў, ад якіх зусім неабавязкова можна дачакацца дакладнага адказу? Непасрэдна ў памяшканні вакзала сёння адпаведнай падтрымкі турысту не атрымаць, паколькі працягваецца рэканструкцыя будынка. А вось прывакзальная плошча ўжо амаль прыведзена ў парадак. Хочацца пажадаць, каб неўзабаве тут знайшлося месца не толькі для таксістаў, але і для турыстычнай інфармацыі. У прыватнасці, для вялікай карты, якая б дапамагла турыстам з'арыентавацца ў падарожжы па горадзе. Вельмі дарэчы будзе і рэклама сувеніраў, якія прапануюцца ў Гродне.

Зрэшты, і цяпер можна падарожнічаць з турыстычнай картай, якая прадаецца ў прывакзальным кіёску. А па больш падрабязныя звесткі варта звярнуцца ў турысцка-інфармацыйны цэнтр на вуліцы Ажэшкі, літаральна побач з чыгуначным вакзалам. Тут ёсць шмат пазнавальных матэрыялаў, прычым, не толькі тых, што датычацца Гродна. Вандроўніку можна, напрыклад, скарыстацца вельмі змястоўным даведнікам па беларуска-польскім памежжы, а таксама турыстычнай картай «Гродзеншчына і Сувальшчына» з маршрутамі па Аўгустоўскім канале.

Па-суседску з турысцка-інфармацыйным цэнтрам, у кніжнай краме да ўвагі ўсіх зацікаўленых — кнігі, даведнікі, паштоўкі, магніты з гродзенскай тэматэкай. А побач, у музеі гісторыі Гарадніцы не толькі ладзяцца выставы майстроў народнай творчасці, але і можна набыць іх сувеніры — вырабы з саломкі, вышыўка, карціны, тыя ж магніты... Зноў жа — мясцовых аўтараў, з беларускім каларытам.

Шчыра кажучы, пакуль не ўзяўся за гэтую тэму, то і не ведаў, як Гродна прадстаўлены на сувенірным рынку. Аказалася, што годна. Выбар пакуль не такі шырокі, як у даўно вядомых у свеце турыстычных мясцінах, але жаданне знайсці сваю «нішу» ў гэтай сферы адчуваецца. Асабліва — у гандлёвым доме «Нёман» у гістарычным цэнтры горада. Сувеніры, якія вырабляюцца не толькі прадпрыемствамі, але і асобнымі майстрамі, знаходзяцца там у адной секцыі з даволі сур'ёзным «канкурэнтам» — парфумай. Хто каго? Загадчыца секцыі Лілія Рачкоўская кажа, што сувенірныя вырабы карыстаюцца вельмі добрым попытам у пакупнікоў і, бывае, даюць да 70 працэнтаў дзённай выручкі, асабліва калі прыходзіць па пакупкі група расіян з турыстычнага аўтобуса.

Перад гасцямі сапраўды не сорамна: выбар, можа, і не на любы густ, аднак вельмі разнастайны. Сувенірныя шкатулкі, талеркі, фігуркі, падстаўкі пад гарачае, бірулькі для ключоў... З беларускімі і, у прыватнасці, гарадзенскімі выявамі, аказваецца, могуць быць не толькі вымпелы, магніты, саламяныя кошыкі ці хлебніцы, не толькі вырабы са шкла (келіхі, піўныя куфлі, попельніцы...), але і нават... візітоўніцы. Альбо сувенірныя наборы «зайчыкаў», як калісьці называліся беларускія грошы. Пры гэтым, зазначае Лілія Рачкоўская, некаторыя турысты купляюць, так бы мовіць, мэтанакіравана: хтосьці калекцыянуе, напрыклад, лялькі, іншыя — кубкі. А значыць, у прапанове сувеніраў трэба ўлічваць і гэта.

**«Гарады майстроў» у нас сапраўды выдатныя, нават з майстар-класамі ад прафесіяналаў ганчарнай ці кавальскай справы. Але заканчваецца свята — і дзе пераважная частка ўсяго гэтага? Чакае наступнага кірмаша?**

Фантазіі аўтараў сувенірнай прадукцыі, калі ёсць творчы падыход, сапраўды няма межаў. Ды і чаму б не быць такому жаданню, калі на гэтыя рэчы ёсць попыт і магчымы паспяховы бізнэс?

Цікаўлюся ў Ліліі Рачкоўскай, дзе яшчэ можна атаварыцца сувенірнымі вырабамі. Яна называе дзве крамы непадалёк — пабываў і там. Выбар сувеніраў не такі вялікі, як у вышэйзгаданым гандлёвым прадпрыемстве, але таксама ёсць чым зацікавіць турыстаў. Ды і, вядома, саміх жыхароў, бо не кітайскія ж рэчы браць, напрыклад, у якасці падарункаў, выязджаючы ў замежжа ці іншыя рэгіёны Беларусі.

Пры гэтым відавочна, што на прылаўках прадстаўлена толькі невялікая частка той прадукцыі рамеснікаў, якая прапануецца падчас кірмашоў на тых ці іншых фестывалях і іншых святочных імпрэзах. «Гарады майстроў» у нас сапраўды выдатныя, нават з майстар-класамі ад прафесіяналаў ганчарнай ці кавальскай справы. Але заканчваецца свята — і дзе пераважная частка ўсяго гэтага? Чакаць наступнага кірмаша?

Вось меркаванне вядомага бондара з вёскі Зарыца Гродзенскага раёна, лаўрэата Нацыянальнай выставы народнага мастацтва «Жывыя крыніцы» Міхаіла Куксы:

— Кожнаму рамесніку паасобку, зразумела, не па сілах адчыніць уласную краму — наняць чалавека, каб прадаваў твае вырабы, плаціць за арэнду памяшкання. Таму мы вельмі зацікаўлены ў партнёрстве з гандлёвымі прадпрыемствамі, нават у атрыманні ад іх заказаў на тую ці іншую прадукцыю, якая карыстаецца попытам. Акрамя таго, вельмі перспектыўным уяўляецца прыцягненне рамеснікаў у месцы масавага адпачынку не толькі на святы, а на пастаяннай аснове.

Безумоўна, гэта павінна рабіцца не на ўмовах платы за гандлёвае месца, як на рынку. Бо выгада можа быць не толькі рамеснікам, якія прапануюць наведнікам свае вырабы, ды яшчэ з майстар-класамі, але і, разам з тым, самому аб'екту. Такое супрацоўніцтва, дарэчы, ужо практыкуецца ў агратурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы».

...Працягваючы падарожжа па гістарычным цэнтры Гродна, на вуліцы Замкавай звяртаю ўвагу на галерэю рамёстваў «Ткалля». Яе гаспадыня Яўгенія Станіна спецыялізуецца ў тэкстыльнай тэхніцы — на вырабах дэкаратыўных палотнаў з лямцу, шыцці з абрэзкаў:

— Гродзенцам і турыстам, асабліва дзецям, вельмі падабаецца сам працэс ткацтва вось на гэтых кроснах. Можна нават самому паўдзельнічаць.

— А ці купляюць вашы рэчы? Не дарагавата?

— Нядаўна я выткала чарговую запраўку, і цяпер кросны не ў рабочым стане — да наступнай запраўкі. Практычна ўсё, што натткана, прадаецца. А што датычыцца грошай... Аўтамабіль таксама нятанны, але ж практычна кожная гродзенская сям'я мае па машыне, а то і па дзве. Да таго ж тканыя рэчы павінны перадавацца з пакалення ў пакаленне і быць прадметам нацыянальнага гонару. Напрыклад, ніводнае нацыянальнае свята ў Японіі не абыходзіцца без кімано. А ці шмат у каго з нас ёсць вось такая тканая кашуля з беларускім арнаментам? Гэта, дарэчы, цудоўны падарунак таму, хто даражыць сваёй культурай і хоча, так бы мовіць, у прасторы і часе адчуваць сябе беларусам.

Вадзім, муж Яўгеніі, адраджае традыцыйнае для Беларусі ў XIX стагоддзі рамяство — вырабляе дошкі-матрыцы для выпякання пячатаных пернікаў. Супрацоўнічаюць у галерэі і з іншымі рамеснікамі з Гродзеншчыны. У прыватнасці, тут прадстаўлены вырабы каваля Івана Перагінца, вышывальшчыцы Настассі Матусевіч, лялькі Вольгі Кудрашовай, чорнадымная кераміка ганчароў Марыі і Сяргея Худзяевых, плеценыя паясы Галіны Церцічнай, скураныя вырабы Вольгі і Сяргея Хомчыкаў... Вось ён беларускі каларыт у самым розным увасабленні.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# ВЕЛАПРАБЕГУ — ДАРОГУ

**У сувязі з правядзеннем 8 верасня спартыўна-масавага мерапрыемства «Велапрабег-2012», прысвечанага 945-годдзю Мінска, у сталіцы будзе часткова абмежаваны рух транспарту па вуліцы Прытыцкага ад праспекта Пушкіна да вуліцы Жудро і прадугледжана змяненне трас шэрагу маршрутаў з 11.45 да 16.00.**

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», рух аўтобусаў маршрута №28 будзе арганізаваны па праспекце Пушкіна, вуліцах Адоеўскага, Бельскага, Прытыцкага. Аўтобусы маршрутаў №№ 50, 163 пойдуць па вуліцы Прытыцкага, праспекце Пушкіна, вуліцы Адоеўскага. Рух аўтобусаў маршрута №77 будзе арганізаваны па вуліцах Прытыцкага, Жудро, Матусевіча, праспекце Пушкіна. Тралейбусы маршрутаў №№13, 44 пойдуць па вуліцах Прытыцкага, Бельскага, Панамарэнкі, праспекце Пушкіна, вуліцы Прытыцкага. Ва ўсіх пералічаных выпадках — у абодвух кірунках. Прыгарадныя аўтобусныя маршруты Заслаўскага кірунку ад дыспетчарскай станцыі «Адоеўскага» па вуліцы Адоеўскага, праспекце Пушкіна. Рух прыгарадных і міжгародніх маршрутаў Ракаўскага кірунку арганізаваны, выключаючы ўчастак вуліцы Прытыцкага ад вуліцы Д. Сердзіча да вуліцы Жудро.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

г. ВИТЕБСК 16.10.2012

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Здание клуба, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, Клюковский с/с, д. Софиевка, д. 29 | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 240/С-30337 (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), бревенчатое одноэтажное, 1969 г.п., общ. площадь 94,4 кв.м, объем 371 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие деревянное, крыша шиферная. Земельный участок: с кадастровым номером 223682706101000025 для содержания и обслуживания клуба, площадь 0,0222 га. Срок аренды – 50 лет. Использование – для специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения. | 100 000 | 100 000 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности, контактный телефон в г. Минске (017) 227 52 54.

**Условия продажи недвижимого имущества:**

осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Условия предоставления земельного участка:**

заключение победителем аукциона с Клюковским сельисполкомом договора аренды земельного участка не позднее двух дней после денежных выплат и осуществление государственной регистрации права на земельный участок в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды.

**Аукцион состоится 16.10.2012 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 15.10.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 16.10.2012 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня подписания протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; **не позднее 12 рабочих дней** со дня подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

7. Информация о проведении аукционов была опубликована ранее в газетах «Звязда» от 26 января 2011 г. № 15, от 15 марта 2011 г. № 47, от 29 апреля 2011 г. № 80, от 11 июня 2011 № 108, от 14 июля 2011 № 131, от 08 сентября 2011 № 171 (27035), от 26 октября 2011 № 204 (27068), от 10 декабря 2011 № 236 (27100), от 3 апреля 2012 № 64 (27179), от 29 мая 2012 № 100 (27215), от 6 июля 2012 № 128 (27243).

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ:

**НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**

**1. Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома индивидуальной застройки (для размещения объектов усадебной застройки), расположенного по адресу: Минская область, Мядельский район, д. Россохи, площадью 0,1566 га (кадастровый № 624083109901000055 с начальной ценой 150 000 000 рублей.**

